ПРОЛЕТАРЫІ УСЯХ КРАІН ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJUSZE WSZYSTKICH KRAJÓW, ŁĄCZCIE SIĘ!

Адрэс РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Менск, Пляц Волі № 17, 1-шы паверх

ТЭЛ. Сакратара—№ 478, Рэдактара—№ 769, Канторы—№ 244, Сакратара прамысловасьці—№ 615

XI ГОД ВЫДАНЬНЯ ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 46 (3135) АЎТОРАК 24 ЛЮТАГА 1931 ГОДУ

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • — 2 р. 70 к. • 6 • — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к.

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

Ленинград, Ата, б-ке

За непахіснае ажыцьцяўленьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі

X ЗЬЕЗД САВЕТАЎ МАБІЛІЗАВАЎ ЧВЭРЦЬ СВАІХ ДЭЛЕГАТАЎ НА ШТУРМ ВЫКАНАНЬНЯ ЗАДАЧ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ

За індустрыялізацыю! У барацьбу за суцэльную калектывізацыю і на яе аснове ліквідацыю кулацтва як клясы

За бальшавіцкую вясну,

на барацьбу за суцэльную калектывізацыю

Учора X Усебеларускі зьезд заслухаў даклад Народнага Камісара Земляробства тав. Рачыцкага аб саўгасным і калгасным будаўніцтве. Гэты даклад разгарнуў перад зьездам саветаў малюнак таго вялізарнага працэсу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, які адбываўся і які на даным этапе з найбольшай сілай разгортваецца ў нашай краіне.

Нашы вялізарнейшыя посьпехі на шляху суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на яе базе кулацтва, як клясы, вызначылі буйнейшыя зрухі ў сельскай гаспадарцы, вызначылі новую расстаноўку клясавых сіл, узмацнілі надзвычайна сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі і зрабілі зусім рэальнай баявую праграму калектывізацыі: 45 проц. сялянскіх двароў БССР да восені 1931 году. Выкананьне гэтай праграмы забясьпечвае нам посьпех агульнага народна - гаспадарчага пляну на 1931 г. — на трэці рашаючы год пяцігодкі, забясьпечвае нам завяршэньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі краіны саветаў.

Апошнія два гады, якія прайшлі з X Усебеларускага зьезду саветаў, прынесьлі нам бурны рост саўгасаў і калгасаў, бурны рост сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі БССР. Калі ў 1928-29 г. пад саўгасамі было 115.000 га, у 1930 г. — 380.000 га, дык у 1931 г. намельную плошчу калгасаў намечана давесьці да 550.000 га, прычым пашырэньне зямельнай тэрыторыі саўгасаў утваралася амаль выключна за кошт так званых «неўдобных» зямель, якія ў нас, у БССР, займаюць каля 21 проц. Ішчэ больш яскравым паказчыкам узросту саўгаснага будаўніцтва і ўзмацненьня саўгасаў зьяўляецца рост іх таварнай і валавой прадукцыі. Калі ў 1928 годзе валавая прадукцыя саўгасаў раўнялася 10,3 млн. руб., дык ужо ў 1929-30 г. валавая прадукцыя саўгасаў узрасла да 16,3 млн. руб.

Саўгасы адыгрываюць цяпер буйнейшую ролю, як вядучы атрад сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Кожны саўгас — гэта фарпост сацыялістычнага наступленьня, кожны саўгас — гэта апорны пункт суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на яе базе кулацтва, як клясы.

У надыходзячую пасеўную кампанію саўгасы павінны адыграць вялізарную ролю; на іх ляжыць задача дапаматчы калгасам замацавацца, дапаматчы калгасам у рамонце інвэнтара, у арганізацыі працы, у абмене ў чыстцы і пратручаньні насеньня, у праве ўзмацненьня калгасаў кіруючымі кадрамі. Саўгасы павінны паказаць зоры бальшавіцкіх тэмпаў падрыхтоўкі да бальшавіцкай вясны. Яны павінны павесьці за сабой калгасы і разам з апошнімі шырокія масы бядняцка - серадняцкага сялянства на выкананьне вялізарнейшых задач другой бальшавіцкай вясны.

З буйнейшымі посьпехамі і ў галіне калектывізацыі прышла БССР да X зьезду саветаў. Мы ўжо за першыя два гады пяцігодкі амаль перавыканалі намёткі ўсяго пяцігадовага пляну.

Жорсткай барацьбе з кулаком, які палёна супраціўляецца разгорнутаму сацыялістычнаму наступленьню, ў бязьлітаснай барацьбе з правымі і «левымі» апартуністамі, у бязьлітаснай барацьбе з прышчэпаўшчынай нам удалося да 10-га лютага 1931 г. абʼяднаць у калгасах 136.000 сялянскіх гаспадарак і тым самым узьняць процант калектывізацыі да 16,7 проц.

Аднак, ня гледзячы на гэтую буйнейшую заваёву нашай партыі, мы ня можам лічыць здавальняючым тэмп арастаньня калгаснай хвалі. Толькі собныя раёны даюць бліскучыя ўзоры барацьбы за новы калгасны прыліў. Рад раёнаў павялічваюць процант калектывізацыі ганебнымі тэмпамі. Раёнаў — Гарадоцкі, Гомельскі, Мезынскі, Рэчыцкі, Бешанковіцкі, Багушэвіцкі, Стара - Дароскі, Церахаўскі і Бабруйскі даюць менш 10 проц. калектывізацыі сялянскіх двароў.

А між тым, у нас ёсьць усе неабходнае для значна больш хуткага ўздыму калгаснай хвалі. Посьпехі першага году калектывізацыі, хуткі рост матар'яльнага дабрабыту калгасных мас, узмацненьне і абнаўленьне тэхнічнай базы калгаснага сэктару, стварэньне новых МТС—усё гэта стварае бліскучыя магчымасьці для выкананьня ліквідацыі калектывізацыі на 1931 г. Вось некалькі характарных даных аб ураджайнасьці ў калгасах і індывідуальных гаспадарках. У той час, калі га азімага жыта ў калгасах давала 8,4 цнт., у індывідуальных гаспадарках з га зьбіралі 7,5 цнт; га аўса ў калгасах давалі 9,2 цнт., а ў індывідуальных гаспадарках — 7,6 цнт.; га бульбы ў калгасах давалі 98 цнт., а ў індывідуальных гаспадарках — 92,7 цнт. І што яшчэ важнейшы, гэта тое, што дынаміка ўздыму ўраджайнасьці ў сацыялістычным сэктары ідзе значна шпарчэй, чым ся ў індывідуальных бядняцка - серадняцкіх гаспадарках.

Мы ўзялі толькі адзін з вялікага раду прыкладаў, якія паказваюць перавагу калгасаў, якія паказваюць, што пры разгорнутай масавай палітычнай работы, пры разгортваньні вялікай арганізатарскай работы сярод беднаты і батрацтва, пры рашучым наступленьні на кулака мы можам значна вышэй узьняць хвалю калгаснага прыліву. І калі мы ў радзе раёнаў ня маем неабходных тэмпаў калектывізацыі, тэмпаў, якія-б забясьпечылі цалкам выкананьне нашых пляноў, дык гэта зьяўляецца вынікам правага апартунізму на практыцы—стаўкі на самацёк, адсутнасьцю работы з беднатой і батрацтвам, недастаткова рашучым разгортваньнем наступленьня на кулака.

З другога боку ня рэдкія факты, калі самі калгасы запрымліваюць прыліў, калі яны ў пасасобных мясцох адмяжоўваюцца ад шырокіх мас бядняцка - серадняцкага сялянства глухой сьцяной, не нясуць у масы сваіх дасягненьняў. Да таго-ж, яшчэ да гэтага часу амаль ў чвэртцы калгасаў не разьмеркаваны яшчэ ўраджай, гэта значыць, што ня толькі паколічныя бядняцка - серадняцкія гаспадаркі ня ведаюць калгасных дасягненьняў, але аб іх ня ведаюць нават самі калгасьнікі.

З усім гэтым трэба рашуча пакончыць, трэба безадкладна пераключыцца на бальшавіцкія тэмпы работы. Трэба скарыстаць усе рычагі, якія забясьпечваюць выкананьне пляну калектывізацыі. І асабліва шырока павінны быць скарыстаны тыя новыя 23 МТС — 23 важнейшых апорных пункты суцэльнай калектывізацыі, якія ўступаюць у строй будаўнікоў сацыялістычнай сельскай гаспадаркі БССР. Нам трэба дамагчыся таго, каб будаўніцтва МТС зрабілася кроўнай справай, справай гонару ўсіх мяцовых арганізацый, усёй савецкай грамадзкасьці.

Вялізарнейшыя вытворчыя задачы, якія стаяць перад намі ў надыходзячую веснавую пасеўную кампанію, у кампанію, на працягу якой мы павінны ў аснoўным ажыцьцявіць большую частку ўсяго пляну сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на 1931 год—у веснавую пасеўную кампанію бягучага году, як ніколі справу вырашаюць тэмпы нашай работы. Мы павінны значна ўзмацніць рух усіх гасак ,усіх мэханізмаў, ад якіх залежыць посьпех бальшавіцкай вясны.

Ва ўяўленьні гэтых абставін X зьезд саветаў мабілізаваў адну чвэрцку свай гэтага складу на правядзеньне ўдарнага месячніку праверкі гатоўнасьці да веснавой пасеўнай кампаніі скончэньня ўсіх відаў загатовак і ліквідацыі ўсіх прарываў на гаспадарчым фронце. Калі 200 дэлегатаў — лепшых ударнікаў заводаў і фабрык, саўгасаў і калгасаў, каля 200 лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы і працоўных мас разьяжджаюцца на месцы, каб там, абапіраючыся на волю калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкае сялянства, з посьпехам выканаць заданьні па посьпяховаму правядзеньню чарговых гаспадарча-палітычных заданьняў.

У сьвеце гэтага факту друкуемая сёньня ў нашай газэце адозва X зьезду саветаў набывае гістарычнае значэньне. Няма ніякага сумненьня ў тым, што зьезд саветаў, які прадстаўляе мільённыя масы, што новыя саветы, абраныя ў абставінах вялізарнейшага ўздыму працоўнага энтузіязму шырокіх мас працоўных, здолеюць мабілізаваць усе сілы, увесь савецкі актыў, усе тыя тысячы новых агітатараў з асяродку калгасьнікаў, каб закончыць з посьпехам загатоўкі ўсіх відаў і забясьпечыць на аснове бальшавіцкага правядзеньня, бальшавіцкай вясны завяршэньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне.

Да ўсіх рабочых і работніц, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства, да ўсіх грамадзкіх арганізацый БССР

Крок за крокам, упэўненым поступам у цесным саюзе і пры падтрымань ні ўсяго СССР, Савецкая Беларусь ідзе па шляху перамаганьня эканамічнай і культурнай адсталасьці—спадчыны царызму, па шляху магутнага ўздыму вытворчых сіл краіны на сацыялістычнай аснове.

Посьпехі разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на ўсіх франтох былі дасягнуты пад выпрабаваным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у жорсткай барацьбе з клясавым ворагам, у барацьбе за чыстату генэральнай лініі партыі супроць усяляких ухілаў і асабліва правага, як найбольш небясьпечнага на даным этапе—супроць «левакоў» і фракцыянэраў з бясьпрынцыпнага права—«левацкага» блёку.

Пад сьцягам партыі Леніна шырокія масы рабочае клясы і калгасьнікаў СССР будуюць сацыялізм пры напружаньні ўсіх сваіх творчых сіл.Рост рэвалюцыйнай актыўнасьці працоўных мас, які зна ходзіць адбітак у шырока-разгорнутым сацыялістычным ударніцтве і спаборніцтве выявіў новыя невычарпальныя крыніцы вытворчага энтузіязму і самаадданасьці справе сацыялізму шырачэзных колаў працоўных.

Няўхільнае правядзеньне ленінскай лініі партыі забясьпечыла магутны размах індустрыялізацыі краіны, бурны рост сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі і вялізарнейшыя зрухі па будаўніцтве сацыялістычнай культуры, нацыянальнай па форме, пралетарскай па зьмесьце.

Працоўныя,як БССР так і ўсяго Савецкага Саюзу, змагаюцца на кожным кроку свайго жыцьця ля варштату, у сельскай гаспадарцы—за справу партыі, за справу Леніна, ажыцьцяўляючы баявы загад—«Пяцігодка ў чатыры гады».

У першыя два гады пяцігодкі сацыялістычная прамысловасьць зрабіла гіганцкі крок наперад,—які можа быць толькі ў краіне пралетарскай дыктатуры. У СССР і адным з яго фарпостаў—Савецкай Беларусі працоўныя будуюць сацыялізм ня толькі для саміх сябе, але для пралетараў і прыгнечаных працоўных краін капіталу Захаду, калёній і паўкалёній Усходу.

Сацыялістычная прамысловасьць БССР, якая сапраўды паказала бальшавіцкія тэмпы, перавыканала плянавыя заданьні на 33,2 проц. звыш намётак пяцігодкі.

Фактам вялізарнейшай гаспадарча-палітычнай важнасьці, бліскучым доказам правільнасьці генэральнай лініі партыі зьяўляецца поўная ліквідацыя, як у БССР, так і ва ўсім Савецкім Саюзе, беспрацоўя.

Батрацтва, бедната і асноўныя масы сераднякоў сталі на адзіна верны шлях, шлях калектывізацыі. Сёньня 17 проц. бедняцка - серадняцкіх гаспадарак БССР будуюць новае жыцьцё на сацыялістычных асновах.

Магутная хваля калгаснага прыбою ўздымаецца ўсё вышэй і вышэй. Гэта дае падставы ўпэўнена заявіць, што калектывізацыя 45 проц. бедняцка-серадняцкіх гаспадарак на працягу 1931 году будзе пасьпяхова ажыцьцёўлена.

Бесьперапынна, штодзённа расьці, перамагаць цяжкасьці, уздымаць на вышэйшую ступень творчую энэргію і ініцыятыву мас працоўных, упарта драпца за павышэньне тэмпаў на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва—вось задача будаўнікоў сацыялізму.

Мы ўступілі ў трэці рашаючы год пяцігодкі, у год калі будзе скончана пабудова фундаманту сацыялістычнай эканомікі, у год, у якім бальшавіцкія тэмпы спэматаваныя гранітнай воляй працоўных пасьпяхова вырашаць перамогу пяцігодкі.

Зьезд зварочвае ўвагу ўсіх працоўных на прарывы, якія ёсьць на сёньняшні дзень у галіне загатовак і мабілізацыі грашовых сродкаў насельніцтва. Па ваду месц ня прынята належных мер да выкананьня і перавыкананьня плянавых намётак па ўсіх відах загатовак і мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Лічбы з фронту загатовак і мабілізацыі сродкаў прымушаюць біць трывогу.

Ільну загатоўлена толькі 30,8 проц. заданьня. Невыкананьне плянаў ільназагатовак зрывае нармальную работу тэкстыльнай прамысловасьці.

Па вывазцы лесу для дрэваапрацоўчнай прамысловасьці і патрэб народнае гаспадаркі выканана толькі адна чвэртка ад плянавых заданьняў. Такое-ж пагражаючае'становішча з забясьпечаньнем апаламі пралетарскіх цэнтраў. Будаўнічых матар'ялаў загатоўлена толькі палова ад тых лічбаў, якія прадугледжаны плянам. Гэта стварае пагрозу зрыву будаўніцтва. Плян вывазкі камня для дарожнага будаўніцтва выканан толькі на 25 проц.

Збожжазагатоўкі выкананы толькі на 90 проц. На фронце загатовак належныя тэмпы яшчэ не ўзяты.

Недапушчальнае становішча мы маем і ў галіне выкананьня плянаў мабілізацыі сродкаў насельніцтва. На 10-II—1931 году квартальны плян мабілізацыі грашовых сродкаў выкананы толькі на 25 проц. Прычым асабліва марудна ідзе спагнаньне розных выплядаў плацяжоў з куллацкіх гаспадарак.

Для ліквідацыі прарываў на фронце ўсіх відаў загатовак і мабілізацыі сродкаў Зьезд абвяшчае з 25-га лютага па 25-е сакавіка ударны месячнік па скончэньні ўсіх відаў загатовак і мабілізацыі грашовых рэсурсаў.

На правядзеньні ўдарнага месячніку X Усебеларускі Зьезд Саветаў пастанаўляе: мабілізаваць 25 проц. дэлегатаў зьезду, неадкладна накіраваўшы іх у раёны.

Таварышы рабочыя і работніцы! Неадкладна мабілізуйце ўсю сваю шэфскую работу і пасылку брыгад на ліквідацыю прарываў.

Таварышы калгасьнікі і калгасьніцы! Вы зьяўляецеся апорай савецкай улады на вёсцы—на вас ускладаецца адказьнейшая задача. Вы павінны сваім актыўным удзелам у гэтай рабоце забясьпечыць перавыкананьне плянаў загатовак і мабілізацыі сродкаў.

Культурныя сілы вёскі чырвонасьцяжнае настаўніцтва! Вы атрымалі Чырвоны сьцяг за перамогі на фронце будаўніцтва сацыялістычнай культуры. Вы павінны давесьці сваю адданасьць за справу сацыялізму і ў часе штурмавога месячніку ліквідацыі прарываў на фронце загатовак і мабілізацыі сродкаў

Таварышы камсамольцы! Пакажэце сапраўды бальшавіцкія ўзоры барацьбы за ліквідацыю прарываў на фронце загатовак. Усе свае сілы, усю творчую энэргію кідайце на фронт поўнага выкананьня пляну загатовак ільну, дроў і лесу, мяса, хлеба, каменьня і мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Таварышы беднякі—сераднякі адз'на асобнікі! Да вас зварачаецца X Зьезд Саветаў з заклакам пад кіраўніцтвам партыі ісьці на штурм прарыву ў галіне загатовак і мабілізацыі сродкаў. Разгортвайце барацьбу з кулаком, які імкнецца сарваць загатоўкі і тым самым нанесьці ўдар па пяцігодцы, па савецкай уладзе. Арганізуйце грамадзкі кантроль над выкананьнем цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі. Пашырайце самаабвяззацельствы па выкананьні загатовак лёну, мяса, малака, масла і каменьня. Памятайце, што толькі поўным і своячасовым выкананьнем плянаў загатовак і мабілізацыі сродкаў узмацняецца Савецкая краіна, памэнтуецца яе абароназдольнасьць. Памятайце, што ад свае часовага выкананьня вамі загатовак залежаць посьпехі сацыялістычнай прамысловасьці, якая палянтае ваш дабрабыт. Памятайце, што ад выкананьня плянаў мабілізацыі сродкаў залежаць посьпехі ў барацьбе за ўвесь народна-гаспадарчы плян.

Сельскія саветы!—вы павінны стаць на чале арганізацыі актыўнасьці мас працоўнага сялянства ў барацьбе за перакрыцьцё прарываў на фронце загатовак і мабілізацыі сродкаў Зьезд заклікае ўсе сельскія саветы быць застрэльшчыкамі па зьнішчэньні прарываў. Сельскі савет—тварам да ліквідацыі прарываў на фронце загатовак—такі загад Х-га Зьезду Саветаў БССР.

Працоўныя жанчыны! Рыхтуючыся да міжнароднага камуністычнага жаночага дню, мабілізуйце ўсе свае сілы на бязьлітасную барацьбу за поўнае выкананьне плянаў загатовак. Пакажэце на справе, што працоўная жанчына была і будзе ў першых радох змагароў за перамогу сацыялізму.

Прафсаюзныя, каапэрацыйныя арганізацыі, дабраахвотныя таварыствы! Мабілізуйце свае сілы і кідайце іх на фронт ліквідацыі прарываў у загатоўках, на фронт мабілізацыі грашовых сродкаў, на фронт разгортваньня падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны.

Поўнае выкананьне ўсіх відаў загатовак забясьпечыць бесперабойную работу заводаў і фабрык і ўздымае яшчэ большую хвалю калгаснага прыліву.

Заданьне па ўсіх відах загатовак і мабілізацыі сродкаў павінна быць перавыканана. Гэтага патрабуюць тэмпы пяцігодкі.

Да ўсіх рабочых і работніц, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства, да ўсіх грамадзкіх арганізацый БССР

На барацьбу за сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы па ліквідацыі прарываў на фронце загатовак і мэблізацыі сродкаў насельніцтва заклікае X Усебеларускі зьезд Саветаў усіх працоўных БССР.

Таварышы рабочыя і работніцы, калгасьнікі і калгасьніцы, беднякі і сераднякі-адзінаасобнікі, працоўная інтэлігэнцыя! Памятайце, што посьпехі на фронце загатовак і мабілізацыі грашовых рэсурсаў ёсьць посьпехі сацыялізму. Памятай, што посьпехі на фронце загатовак і мабілізацыі сродкаў узмацняюць абароназдольнасьць краіны і даюць зьнішчальны адпор клясавым ворагам, як унутры краіны, гэтак і замежным імпэрыялістам.

Усе як адзін станем у рады барацьбітоў за поўнае выкананьне загатоўчых і грашовых плянаў. Дамо пралетарскай дзяржаве хлеб, мяса, дровы і лес, масла і малако, грашовыя сродкі. Пабудуем добрыя дарогі і выканаем пляны камнязагатовак. Падрыхтуемся да веснавой сяўбы. Уздымем новую хвалю калгаснага прыліву.

Няхай не спадзяюцца замежныя імпэрыялістыя на падрыў падмуркаў дыктатуры пралетарыяту. Пралетары СССР і БССР, абапіраючыся на падтрыманьне сусьветнага пралетарыяту, у цесным саюзе з працоўным сялянствам пад кіраўніцтвам слаўнай бальшавіцкай гвардыі жалезным поступам пойдуць уперад да канчатковай перамогі сацыялізму.

За яшчэ больш высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва!

За непахіснае змаганьне па ажыцьцяўленьні задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі!

За ўзмацненьне абароназдольнасьці СССР і яго непарыўнай часткі—Савецкай Беларусі!

Няхай жыве ленінская партыя бальшавікоў і яе правадыр тав. СТАЛІН!

Няхай жыве дыктатура пралетарыяту!

Старшыня Х-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Х-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў А. ХАЦКЕВІЧ.

23 лютага 1931 г. г. Менск.



«Дом Культуры» ў якім адбываецца Х-ты Ўсебеларускі Зьезд Саветаў.

Зьезд аднадушна ўхваліў работу ўраду

Заслухаўшы справаздачны даклад Старшыні Савету Народных Камісараў БССР тав. ГАЛАДЗЕДА аб дзейнасьці Ўраду, Х Ўсебеларускі Зьезд Саветаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Палітычную лінію Ўраду прызнаць правільнай, адпавядаючай цалкам генэральнай лініі Камуністычнай партыі, і практычную дзейнасьць ухваліць.

2. Для распрацоўкі рэзалюцыі па дакладу Ўраду вылучыць Камісію ў складзе т. т.:

Галадзед, Гей, Чарвякоў, Аронштам, Валодзька, Лоцманаў, Арашчук, Шашкоў Сьцяпан, Будзінскі, Вашкевіч, Міцькоў, Каргузінова, Сіленкоў, Палякоў, Хаскін, Хацкевіч, Калнін, Краплан, Рыжоў, Сапрыцкі, Няськевіч, Горын, Лаціс, Раух, Бэнэк, Невяроўская, Вэндэ, Войцэховіч, Шапіра, Каралёў, Козінцаў, Дрынава, Мікуловіч, Горбачоў, Сьцяпанаў, Жалезны, Кардашэнка, Бэрзінг, Гнілякевіч, Цэнцыпер, Яцкевіч, Дубіна, Гольдбэрг, Рапгпорт, Грысевіч, Шаранговіч, Навумаў, Ластоўскі, Рачыцкі, Платун, Фэльдман.

Учора на зьезьдзе

▲ На месцы старшыні—Каралёў. Ён нацискае на званок. Дэлегаты сьпяшаюцца заняць месцы. Зьезд працягваецца.

— Vl паседжаньне абвяшчаю адкрытым.

▲ Працягваюцца спрэчкі па дакладу тав. Галадзеда.

▲ Звонкі, спакойны голас т. Дунца.

— Я спынюся на адным з пытаньняў з сэрыі важнейшых пытаньняў нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Я буду гаварыць аб нацыянальным пытаньні Тав. Дунец гаворыць аб тым, як урад разьвязваў нацыянальнае пытаньне. Ён гаворыць аб дасягненьнях:

— Колькасьць устаноў на яўрэйскай мове павялічылася за адзін год амаль у два разы. Навучальнымі ўстановамі ахоплена 90 проц. дзіцячага насельніцтва. За адзін год выпушчаны паўмільённы тыраж літаратуры на яўрэйскай мове.

— Сталінская формула: «нацыянальная культура па форме, пралетарская па зьмесьце» — вось аснова, на якой мы будуем сваю работу сярод нацыянальных меншасьцяй.

А ў Польшчы, а ў нашай суседзі?

— Прадстаўнікі яўрэйскага фашызму ў польскім сойме заявілі: «у нас, у Польшчы, старыя царскія законы для яўрэяў».

А ў Польшчы.

— Рост антысэмітызму. 10.000 беспрацоўных яўрэяў-тэкстыльшчыкаў.

А ў Амэрыцы, краіне буржуазнай «свабоды і культуры».

— Толькі ў адным Нью-Йёрку 200 тысяч беспрацоўных яўрэяў.

▲ Уважліва выслухаў зьезд разьлікі тав. Гольдбэрга аб торфе. З торфам у Беларусі становішча цяжкае. У 1928 годзе роля торфа ў апале займала 31 проц. У 1929-30 г. торф павінен быў складаць 35 проц. Заданьне гэтае ня выканана. Ужываньне торфу зьмяншаецца. Замест торфу палім вугаль. Гэта злачынна.

— Трэба мэханізаваць здабываньне торфу. Пачатак торфараспрацовак на носе. Ці гатовы мы да гэтых распрацовак?—пытае ў зьезду т. Гольдбэрг.

— Не, яшчэ не гатовы...

▲ У кожным калгасе павінен быць цір. Паставім перад сабой такую задачу,—сказаў тав. Лаціс у сваёй прамове, у якой удала былі зьвязаны пытаньні калектывізацыі, індустрыялізацыі і абароны краіны.

▲ Пасьля т. Бакума—работніцы фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» і тав. Цэнцыпара—Нарком Аховы здароўя, да трыбуны падыйшоў дэлегат у матроскім гарнітуры:

— Ня з ведамсьцьвеннага пункту гледжаньня, а па праву трэба на зьезьдзе ўспамінуць аб камсамоле. Шкада, што да мяне ніхто з дэлегатаў гэтага не зрабіў.—так пачаў сэкратар ЦК ЛКСМБ тав. Палякоў.

— Па ліку мы адкрылі Х зьезд, а па значнасьці ў пэрыяд будаўніцтва сацыялізму—першы.

Удала зьвязаліся выступленьні тав. Палякова асноўныя пытаньні, што стаяць перад зьездам, і ўдзелам рабочай калгаснай і бядняцка-серадняцкай моладзі.

▲ — Мне прыдзецца гаварыць аб слабых вучастках работы ў нашай рэспубліцы, — сказаў выступіўшы ў спрэчках прадстаўнік ЦК УсеКП(б) і Саюзнага СНК па мабілізацыі сродкаў тав. Ліўшыц.

— Я буду гаварыць аб мабілізацыі сродкаў і аб фінансавым пляне.

— Фінансавая дысцыпліна — аснова выкананьня фінансавага пляну.

▲ Калі старшынствуючы назваў прозьвішча Андрэя Аляксандровіча, некаторыя з дэлегатаў прарочтвалі:

— Вершы зачытае.

Аляксандровіч вершаў ня чытае. Ён гаварыў аб контррэвалюцыйнай ролі ранейшага нацдэмаўскага кіраўніцтва БАН, аб контррэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызьме і аб пралетарскай літаратуры.

— Расьце новая пралетарская літаратура. Яна будзе моцным цамэнтам у фундамант сацыялізму.

▲ — Нам патрэбна сёлета падрыхтаваць 116.820 рабочых масавых прафэсій. У мінулым годзе мы падрыхтавалі толькі 46.830 рабочых. Адных сэзонных рабочых сёлета патрабуецца 326 тысяч,—гэтыя лічбы паведамляў зьезду тав. Гнілякевіч,—Нарком працы, гаворачы аб праблеме кадраў.

▲ У гісторыі дзевяці папярэдніх зьездаў саветаў у Беларусі яшчэ такога факту ня было. Сёньня зьезд мабілізаваў частку сваіх дэлегатаў на ліквідацыю прарываў у загатоўчых кампаніях і мабілізацыі сродкаў у насельніцтва на правядзеньне бальшавіцкай вясны. 25 проц. дэлегатаў пакідаюць зьезд і едуць на месцы штурмаваць прарывы.

▲ Глыбокая ўвага, з якой зьезд слухаў заключнае слова тав. Галадзеда—звычайнае зьявішча. У працягу трох чвэртак гадзіны тав. Галадзед даў адказку спрэчак і спынуўся на вузлавых пытаньнях, закранутых дэлегатамі ў працягу амаль 2-х дзён.

▲ Ад Менскай, Віцебскай, Гомельскай і інш. дэлегацый тав. Валодзька ўносіць прапанову:

— Палітычную лінію Ўраду прызнаць правільнай, адпавядаючай цалкам генэральнай камуністычнай партыі і практычную дзейнасьць ухваліць.

▲ Не гледзячы на тое, што доўгія воплескі ясна паказвалі, што прапанова гэта прымаецца, старшыні ўсё-ж такі просіў галасаваць мандатамі.

— За... супроць... устрымаліся...

— Прынята аднагалосна

Новая бура авацый.

▲ На гэтым VI паседжаньне закрылася. Увесь зьезд арганізавана выйшаў на вуліцу.

▲ Тры грузавікі перагарадзілі вуліцу, на якой адбываецца зьезд. Прыстаўленыя грузавікі рубам адзін да аднаго, зрабілі трыбуну. На трыбуне пэ зыдыум зьезду. Стройнымі радамі выстраіліся дэлегаты па абодвых баках. На гнядым жарабку падскоквае тав. Цімашэнка і рапартуе:

— У гонар Х Усебеларускага зьезду дэманстрацыя часьцей Менскага гарнізону ў дзень 13 гадавіны Чырвонай армії прадстаўлена.

▲ Фанфары апавяшчаюць аб пачатку дэманстрацыі. Марш. Стройныя калёны. Лес штыхоў.

▲ Рысцою праімчалася конніца, з грукатам прайшла артылерыя. Калёны пранесьлі лёзунгі:

— Порах трымаем сухім.

— Кожная куля ўдарніка-байца ў сэрца імпэрыялізму.

Гэта была дэманстрацыя магутнасьці Чырвонай армії. У XIII гадавіну Чырвонай армії яна навочна паказала зьезду гатоўнасьць ахоўваць межы краіны, якая будзе сацыялізм.

▲ На вячэрнім паседжаньні тав. Рачыцкі зрабіў даклад Наркамзему аб саўгасным і калгасным будаўніцтве.

▲ Нязьлічоныя дэлегацыі ад рабочых, калгасьнікаў, саўгасаў прышлі вітаць зьезд.

▲ Польскі калгас імя Дзяржынскага, рабочыя саўгасу «Іван» саўгас «Бабінічы», завод «Чырвоны Мэталіст», саўгас «Барань», рабочыя Гомсельмашу, Гомшвэю, нямецкі калгас імя Розы Люксэмбург у сваіх рапартах да зьезду гаварылі аб сваіх даасягненьнях, самакрытычна гаварылі аб сваіх недахопах, заяўлялі аб гэтым галосна перад усім зьездам і тут-жа абяцалі выправіць гэтыя недахопы.

▲ Ад тысячнай сьвяцоўай армії—рабочых друкарні імя Сталіна расказалі зьезду аб камуністычных цэхах, аб ударных брыгадах і рабоце ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. Калі дэлегацыя зыходзіла з трыбуны, яны раскідалі газэты са сьвежым пахам фарбы сярод дэлегатаў. У залі шум.

▲ — Сьцяг ЦВК сталёвага каня, не аддамо!—заявіў тав. Аксючыц—палявод камуны «Працы» Ельскага раёну, вітаючы зьезд.

Камуна атрымала пераходны сьцяг і трактар у конкурсе, арганізаваным па ініцыятыве газэты «Савецкая Беларусь». Аб гэтым трактары і аб гэтым сьцягу гаварыў т. Аксючыц.

Беларусы, украінцы, яўрэі, немцы, чэхі—вось склад камуны.

— Апошняя 16 жанчын ліквідуюць сваю пятісьменнасьць.

— Ураджай жыта ў адзінаасобнікаў—45 пудоў, у камуне—130 пуд. Бульба—450 у адзінаасобнікаў, 14300—у камуне.

— У выніку савецкай эстафэты, праведзенай газэтай «Савецкая Беларусь»—новы прыліў у камуну.

— Інвэнтар цалкам адрамантаваны, каб драць дасдаўскія межы, ваколічных бедняцка-серадняцкіх гаспадарак.

▲ Вось рапарт камунараў зьезду.

* * *

Сёньня а 5 гадзіне ўвечары на пляцы імя Фінна Усебеларускай лыжнай эстафэты «Працоўных дасягненьняў і гатоўнасьці да абароны краіны», у гонар Х зьезду саветаў БССР.

Сёньня ў Менск прыбываюць на лыжах лепшыя фізкультурнікі—ўдарнікі фабрык, заводаў з розных куткоў Савецкай Беларусі з рапартамі аб працоўных дасягненьнях сацыялістычнага будаўніцтва ў выкананьні плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі, як у прамысловасьці, так і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, фабрык, заводаў, калгасаў і саўгасаў.

А 8 гадзіне ўвечары ў Белдзяртэатры адбудзецца агульна-гарадзкі масавы вечар, арганізуемы Вышэйшым Саветам Фізычнае Культуры Беларусі і Цэнтральным Саветам Асо-Авіяхім і прысьвечаны фінішу Ўсебеларускай прадбудучаму старту Менск-Масква Ўсесаюзнай эстафэты і дню сьвяткаваньня XIII-й гадавіны Чырвонай армії.

З. Т.

РВС Саюзу ССР—т. Варашылаву

X Усебеларускі зьезд саветаў у дзень XIII-гадовага існаваньня нашай геройчнай Рабоча - Сялянскай Чырвонай армії пасылае Рэвалюцыйнаму Ваеннаму Савету рэспублікі гарае пралетарскае прывітаньне ад імя рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас Савецкай Беларусі. У гэтыя дні, калі ўсе рэакцыйныя сілы рухнелага буржуазнага свету, у прыадках клясавага шаленства ліхаранчна рыхтуюць новы ўзброены напад на ўступіўшую ў паласу сацыялізму краіну пралетарскай дыктатуры, гэтыя дні, калі над Савецкім Саюзам і ўсім сьветам навісьлі новыя грозныя хмары правацыруемай імпэрыялістамі сусьветнай бойкі — працоўныя Савецкай Беларусі з асаблівай увагай і любоўю абкружаюць сваю ляўную Чырвоную армію.

Працоўныя Савецкай Беларусі на чале з пралетарыятам, пад выпрабаваным у вялікіх клясавых бойках кіраўніцтвам камуністычнай партыі, прыладуць усе сілы да таго, каб павялічыць абароназдольнасьць Чырвонай армії, каб палепшыць яе тэхнічнае ўзраеньне, каб павялічыць пралетарскую сьвядомасьць чырвоных байцоў.

Узмоцненай барацьбой за поўнае і сабаковае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за бальшавіцкія тэмпы, за пяцігодку ў чатыры гады, за бальшавіцкую сяўбу, за далейшую калектывізацыю, за ліквідацыю кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, за лінію партыі,—мы ўзмацнім базу абароназдольнасьці краіны.

На X Усебеларускім Зьезьдзе Саветаў

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ тав. ГАЛАДЗЕДА

22 лютага. Ранішняе пасяджэньне

т. Кудзелька

Вялізарныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва БССР, шпаркі рост прамысловасьці, павялічэньне пралетарыяту, перавод сельскай гаспадаркі на шлях калектывізацыі,—усё гэта гаворыць за тое, што генэральная лінія партыі правільная.

Справа з работай нашых сельсаветаў абстаіць ня зусім добра. Сельсаветы ў значнай сваёй частцы ня сталі яшчэ сапраўднымі арганізатарамі мас, ня здолелі арганізаваць масу, актывізаваць яе, накіраваць на тыя задачы, якія пастаўлены ў нас на вёсцы. **Трэба ўзмацніць работу нашага савецкага апарату—і ў раёне, і ў сельсавеце. Гэта адна з асноўных задач, якую мы на бліжэйшы час павінны выканаць.**

Мне здаецца, што зараз пасьпеў час паставіць пытаньне аб скарачэньні некаторай часткі раёнаў таму, што некаторыя раёны ні палітычных, ні эканамічных падстаў да свайго існаваньня ня маюць.

Два слова аб цэнтральным апараце. Бязумоўна, паасобныя зьвяньні як раённага, так і цэнтральнага апаратаў не спраўляюцца са сваёй работай. Мы, таварышы, адкінулі хлусьню правараўлякага» блёку аб тым, што наш дзяржаўны савецкі апарат не прыстасаваны для правядзеньня ў жыцьцё пастаўленых партыяй задач, але ў паасобных зьвеньнях нашага апарату як цэнтральнага, так і раённага ёсьць значныя перабоі, якія шкодзяць правядзеньню ў жыцьцё тых задач, якія перад намі стаяць. Напрыклад, возьмем правядзеньне кантрактацыі яравых у гэтым годзе. Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР была надрукавана 21 студзеня 1930 г., адозва ЦК КП(б)Б і СНК БССР была надрукавана 3 лютага. Там былі дырэктывы НКЗему Белкалгасцэнтру, НКФіну і вось да 15 лютага ў раёнах ніякай інструкцыі на было як правесьці гэтую кантрактацыю.

Калі ўзяць Белкалгасцэнтр, то ня гледзячы на бамбардыроўкі з раёнаў аб высылцы статута калгасаў у зьвязку з зрывам бяднацка-серадняцкага сялянства ў калгасы, ад Белкалгасцэнтру да гэтага часу няма ніякага адказу.

т. Канчэльсон

(Стара-Дароскі раён).

Таварышы, ад імя інтэрнацыянальнага калгасу «Дзесяцігодзьдзе Кастрычнікавай рэвалюцыі», дазвольце шчыра вітаць X Усебеларускі зьезд саветаў (воплескі).

Калектывізацыя залежыць у значнай частцы ад рашучай барацьбы з кулацка-заможнай часткай вёскі, якая перашкаджае нам у правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў партыі і ўлады.

Неабходна няўхільна штодзённа працаваць сярод беднаты,

Толькі пры самым рашучым змаганьні з клясавым ворагам, мы зможам выканаць тыя плянавыя задачы, якія стаяць перад намі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

т. Катлінская

(Грэскі раён).

Я хачу адзначыць, што мы яшчэ да лёка ня выканалі тых дырэктыў партыі і нашага ўраду, якія былі вызначаны. Мы тут мелі рад перашкод і асноўнай перашкодай зьяўляецца кулак, які яшчэ не дабіты.

У нас яшчэ ёсьць раёны, дзе гавораць: «ў нас няма кулака». Я з тым ня згодна. Кулацтва яшчэ не выкарчавана і на сёньняшні дзень. Гэтага ня трэба забываць і трэба з ім рашуча змагацца.

Работа сярод жанчын праводзіцца недастаткова. Мы павінны паставіць на належную вышыню работу нашых мэдычных установаў, ясель, дзіцячых пляцовак і г. д., пашырыць іх сетку, каб даць магчымасьць працоўнай жанчыне прымаць яшчэ большы актыўны ўдзел у сацбудаўніцтве.

т. Аніш анка

(Ельскі раён).

Мы павінны выканаць усё тыя заданьні, якія вызначыў тав. Галадзед ў сваім дакладзе. Мы выканаем пяцігодку ў 4 гады. Мы на вёсцы імкнемся хутчэй уцягнуць нашы аднаасобныя бяднацка-серадняцкія гаспадаркі ў калгасы, але бяда ў тым, што часта бядняк і серадняк яшчэ знаходзяцца пад уплывам нашых клясавых ворагаў — кулакоў.

Замежная буржуазія піша ў газэтах, што ў нас лесазагатоўкі выконваюцца пад прымусам, але я павінна сказаць, што калі мы склікаем сходы і растлумачваем селянам, што трэба вы канаць загатоўкі, сяляне ніколі не адмаўляюцца ад гэтага.

т. Ткачэнка

(Ельскі раён).

Значныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, якія мы маем у нашай Савецкай Беларусі, гавораць аб тым, што наш урад з сваёй працай спраўляецца.

Праблема кадраў пакуль што яшчэ ня вырашана, кадраў не хапае. А таму трэба лепш разьмяркоўваць маючыя кадры і больш мэтазгодна іх скарыстоўваць. У нас у раёне маецца ўсяго два лекары, замест 6, якія павінны быць па штату, а ў гэты час мы назіраем, што па некаторых гарадох ёсьць беспрацоўныя дактары.

Зараз работа саветаў набывае вялікае значэньне. Сельсаветы павінны стаць на чале калгаснага руху, а таксама павінны стаць арганізатарамі і кіраўнікамі ўсяго палітычнага і эканамічнага жыцьця на сваёй тэрыторыі. Мы павінны перабудаваць работу сельсаветаў, уцягваючы ў работу сельсаветаў усё большыя і большыя масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў.

Мы нядаўна правялі ў сваім раёне савецкую эстафэту. Нам патрэбны жывыя новыя мэтады ў нашай рабоце, мы павінны абменьвацца вопытам на падставе тых ці іншых дасягненьняў, павінны разьвіваць гэтыя дасягненьні і надалей. **Трэба адзначыць, што дзякуючы эстафэце, якую праводзілі па ініцыятыве газ. «Савецкая Беларусь», мы дабіліся значных посьпехаў і за час да X-га зьезду процант калектывізацыі павялічылі з 14 да 24. Добра было-б каб наш урад вылучыў адзін з раёнаў у якім бы прапрацоўваліся як у лябараторыі розныя мэтады працы саветаў і перанесліся ў іншыя раёны.**

т. Пашвінчук

(Бялыніцкі раён).

Тыя посьпехі, якія мы мелі за час з IX-га зьезду на сучасны момант сьведчаць аб тым, што лінія кіруючай ленінскай партыі і ўраду БССР была і ёсьць адзіна правільнай.

Поруч з посьпехамі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва ў нас яшчэ ёсьць рад недахопаў, якія перашкаджаюць нашаму будаўніцтву. Можна прывесьці рад прыкладаў аб тым, што ў нас яшчэ ў некаторых установах ёсьць бюракратызм і валакіта. Напрыклад, па лініі ВСНГБ у керамічнай прамысловасьці ёсьць такія выпадкі, калі пасылаюць тыя ці іншыя спробы, для таго каб пачаць пабудову заводу ці выбраць месца для яго, а гэтыя спробы ў керамічных лябораторыях ляжаць месяцамі, а часамі і цэлы год з-за якіх-небудзь зусім незначных прычын.

Мы яшчэ недастаткова аддаем увагі сельсаветам у напрамку перабудовы іх работы і яны ў шмат мясцох яшчэ не зьяўлюцца арганізатарамі мас. Сельсаветы часта па старынцы хочуць самі выконваць усю работу, не мабілізуючы на яе калгасны і бядняцка-серадняцкі актыў.

тав. Дубіна

Урадам БССР і НКПаштэлям нашага Саюзу прыняты рашучыя меры для таго, каб карэнным чынам палепшыць гаспадарку сувязі. Пасьля ліквідацыі кругі нам неабходна абавязкова зьвярнуць тэлефонам, тэлеграфам наш рэспубліканскі цэнтр—г. Менск з раёнамі. Акрамя таго правесьці тэлефанізацыю і радыёфікацыю прымежных раёнаў і раёнаў суцэльнай калектывізацыі. Выходзячы з гэтай установкі, мы на гэты год вызначылі зьвязаць 80 раёнаў з Менскам, да канца гэтага году правесьці тэлефанізацыю 50 раёнаў і адначасова правесьці радыёфікацыю гэтых раёнаў. Зараз мы праводзім тэлефанізацыю ў 17 раёнах. Гэту работу мы паводле нашага пляну закончым да 1 ліпеня г. г., а іншыя раёны будуць тэлефанізаваны да канца 1931 г. Потым будзе пабудавана новая тэлеграфна-тэлефонная лінія на 10 тыс. кілёмэтраў, інакш кажучы, гаспадарка сувязі БССР павялічыцца ў два разы.

У нас зараз будуецца аўтаматычная поўнасьцю будзе скончана да жніўня тэлефонная станцыя ў Менску, якая месяца. У тэтым годзе пачынаем будаваць аўтаматычныя тэлефонныя станцыі ў Віцебску, Магілеве і Гомлі.

Мы дамагаемся таго, каб наша пошта ў сёлах зварочалася ня менш як 4 разы ў пяцідзёнку.

Пэрыядычныя выданьні зараз распаўсюджваюцца НКПаштэлям, што пакуль што гэта справа поўнасьцю не наладжана. Неабходна ў раёнах вылучыць спэцыяльных людзей, раённых арганізатараў па распаўсюджваньні друку.

Трэба мабілізаваць усю нашу грамадзкасьць вакол распаўсюджваньня друку.

Самым хваравітым зьвяшчам, якое адбіваецца на скажэньні тэлеграфу зьяўляецца тое, што наш апарат дагэтуль не беларусізаваны. Мы маем з боку некаторых нашых працаўнікоў праявы вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму. Мы вядзем самую рашучую барацьбу з праявамі вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, але раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі нам павінны рашуча дапамагчы, каб мы як мага хутчэй змаглі правесьці беларусізацыю нашага апарату.

т. Вашкевіч

Аналізуючы ўсю дзейнасьць нашага ўраду, мы павінны заявіць, што палітычная лінія ў рабоце яго была цалкам і поўнасьцю правільнай і што работа ўраду БССР была здавальняючай.

Перад намі стаіць вельмі важная задача—гэта праверка выкананьня нашых пастаноў. **Тав. Сталін** у апошняй сваёй прамове падкрэсьліў, што справа заключаецца не ў рэзалюцыі, бо рэзалюцый у нас дастаткова, а ў праверцы

Делегат зьезду Алексенка (калгасьнік).

актычнага выкананьня таго, як праходзяцца гэтыя рэзалюцыі ў жыцьцё. Не здаецца, што тут мы маем вялікія рабелы і X-ы зьезд Саветаў павінен за гэта зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Я хачу спыніцца на дарожным будаўніцтве. З боку РВК робіцца ўсё, каб дапамагчы дарожнаму будаўніцтву, каб арганізаваць гэтую справу, але з боку дарожных арганізацый мы маем да гэтага часу зрыў дарожнага будаўніцтва. Вось, напрыклад, у нашым раёне на дарожнай станцыі ёсьць нарад на 1200 фурманак штодзённа, даюць дакладныя адрасы дзе і як атрымаць гэтыя фурманкі. Калі пачалі правяраць гэтую справу, як скарыстоўваюцца фурманкі, дык аказваецца, што толькі 5 проц. скарыстоўваецца.

Тое самае мы маем і з лесазагатоўкамі. **Калгасьнікі на раённым зьезьдзе саветаў, заслухаўшы паведамленьне аб тым, што амэрыканскія імпэрыялісты забараняюць вывозіць з Поўначы лес у Амэрыку, вынеслі пастанову ўсім выехаць на работу ў лес пад лёзунгам «Наш адказ імпэрыялістам Амэрыкі». Калі высьветлілася, што прыблізна 3.000 калгасьнікаў выяжджае ў лес, ака залася, што наш лясны апарат не падрыхтаваўся да таго, каб адразу прыняць гэткую армію.**

Тав. Арэшчук

(Лёзьнянскі р-н)

Тыя лічбы і факты, якія тут праводзіў т. Галадзед у галіне сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, якое мы праводзім пад непасрэдным кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і яе Ленінскага ЦК гавораць аб тым, што лінія ўраду БССР з моманту IX зьезду Саветаў да X зьезду зьяўляецца бязумоўна правільнай і накіраванай на ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Адмак, кажучы аб дасягнутых посьпехах, мы не павінны на зьезьдзе абыйсьці моўчкі недахопы, якія мы маем. У прыватнасьці скажу аб недахопах у планаваньні з боку нашых асобных цэнтральных установ.

Напрыклад, НКЗем праводзіць спэцыялізацыю раёнаў зьверху, ня ўлічваючы мясцовых умоў. Так, у Лязьнянскім раёне калгасы так «спэцыялізаваліся», што ня гледзячы на тое, што гэты раён зьяўляецца ільнаводным, зараз удзельная вага лёну ў ім у параўнаньні з мінулым годам зьменшылася. Некаторыя калгасы «спэцыялізаваліся» па тры разы. НКЗем павінен больш глыбока падыйсьці да непасрэднага кіраўніцтва раёнамі.

Апарат сувязі, па маёй думцы, на сёньняшні дзень зусім не адпавядае свайму прызначэньню. Я ўжо не кажу аб тых блытаных тэлеграмах, непаразуменьнях, якія часта выклікаюцца тэлеграмамі. Я вам магу прывесьці прыклад калі даецца тэлеграма аб тым, што: **«арганізуйце адгрузку бульбы»**,—а ў тэлеграме пішуць,—**«арганізуйце зрыў адгрузкі бульбы»**.

Тав. Шэлаг

Таварышы, дазвольце вітаць ад калгасу імя «Будзённага» і ад батракоў і беднякоў акаляючых вёсак (воплескі).

Наш калгас арганізаваўся ў 1925 г. з 7 гаспадарак. Зараз у нашым калгасе 33 гаспадаркі і 18 батракоў. За 1929-30 год мы павялічылі сваю гаспа-



дарку на 100 проц. У нас было 12 галоў рагатай жывёлы, на сёньняшні дзень (у нас сьвінагадоўчы ўхіл) у нас маецца 170 сьвіней.

Я батрак ужо 48 гадоў. Перанёс шмат цяжкасьцяй. Я ўпэўнен, што здзіны правільны шлях—калгасны шлях.

т. Сокалаў

(Сіроцінскі раён)

З лічбаў дакладу т. Галадзеда і з усёй нашай работы можна зрабіць вывад адзін, мы ня толькі ідзем, але мы імчымся ўперад нячуванымі і нябачнымі ні ў гісторыі тэмпамі.

Я хачу спыніцца на тых недахопах, якія яшчэ маюцца ў нашай рабоце, ў паасобных галінах.

Належнай плянавай работы ў раёне няма.

Ня лепш з плянаваньнем і ў асобных наркаматах. Наркамгандлю дае настолькі няўстойлівыя плянавыя паказьнікі, што яны зьмяняюцца на працягу 10 дзён. Напрыклад, для Сіроцінскага раёну 26-XII даецца заданьне па мясазагатоўках на адну суму, 28-XII зьмяняецца і даецца другая лічба, 2-I—31 г. па тых-ж мясазагатоўках даецца трэцяя лічба і 9-I—чацьвёртая. Ці-ж можна працаваць, калі на працягу 2-х тыдняў чатыры разы зьмяняюцца плянавыя заданьні. Па лініі НКЗему таксама няма цьвёрда ўстойлівых плянавых паказьнікаў. Пля навыя паказьнікі зьмяняюцца па 3-4 разы.

т. Сапрыцкі

Тав. Галадзед, нажаль, у сваім дакладзе ўлусьціў такі момант, як пытаньне ўзмацненьня і рэарганізацыі савецкага апарату. Канчаткова зацьверджанага бюджэту ў нас у раёне па сёньняшні дзень няма.

(Бэнэк—бюджэт ужо зацьверджан).

Сапрыцкі. Факт той, што бюджэту ў нас няма, мы дабіваліся яго ў НКФіне, але не дабіліся.

Плян НКЗему прадугледжвае, што 50 проц. нашага стада будзе ахоплена сацыялістычным сэктарам. Ці маюцца ў нас паказьнікі таго, што мы будзем булаваць, якія будаўнічыя матар'ялы нам дадуць? Ці маецца ў нас балянс будаўнічых матар'ялаў хоць-бы ў Беларускім разрэзе. Не, такога балянсу няма. Трэба будаўніцтва сьвінагадоўчых і наогул жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў прыраўнаць да прамысловага будаўніцтва і ў адпаведнасьці з гэтым забясьпечыць дэфіцытнымі будаўнічымі матар'ялямі.

т. Крапан

(Жлобінскі раён).

Трэба зьвярнуць больш увагі на выкананьне. У нас ёсьць рабочыя вынаходны, але іх праэкты ляжаць часта недзе «пад сукном» і іх ніхто не разглядае і не правярае.

Тав. Вальфсон

У дакладзе т. Галадзеда перад намі прайшоў яскравы малюнак вялікіх перамог рабочай клясы, калгасьнікаў, бяднацка-серадняцкага сялянства ў тых бойках, якія яны вядуць за сацыялізм пад кіраўніцтвам партыі. Гэты малюнак стаў яшчэ больш яскравым ад супроцьстаўленьня яго таму, што робіцца на Захадзе. І вось ня будзе, мне здаецца, памылкай сказаць, што **ўсе тыя вялікія перамогі, аб якіх тут гаварылі, атрыманы таму, што бойкі за сацыялізм ідуць на чале з ударнымі брыгадамі сусьветнага кастрычніка, сталёвай бальшавіцкай партыі, пры ўдзеле мільённых рабочых і працоўных мас сялянства.** Гэты энтузіязм працоўных мас у пабудове сацыялізму адчуваўся ў нас, пачынаючы з моманту выступленьня дэлегэцый ад нашых ударных прадпрыемстваў, чыгуначнікаў, якія гавораць аб транспарце і да апошняга калгасьніка, які з захапленьнем кажа аб дасягненьнях калгаснага будаўніцтва.

Калі мы таворым аб нашых перамогах тут на зьезьдзе, дзе прадстаўлены інтарэсы і воля працоўных мас нашай БССР, варта спыніцца на тым, якое месца адводзілі шкоднікі з прампартыі, якія марылі аб «ураздзе інжынэраў», якія марылі, што інжынэры—«соль зямлі рускай» і што яны павінны кіраваць адзінай і непадзельнай Расіяй па ўказцы францускіх і ангельскіх банкіраў.

Учора нам расказаў тав. Галадзед, што разам з усесаюзнымі Рамзінамі працавалі і іх дапаможнікі—беларускія рамзіняты. Яны таксама марылі, што Беларусьсю будзе кіраваць нейкі «ўрад інжынэраў». Тут была стаўка на кастаную групу буржуазнай інтэлігенцыі, якая будзе кіраваць мільёнамі працоўных і гэта было тым зьвяном, якое аб'яднала ўсесаюзных Рамзіных з беларускімі рамзінятамі в Дзяржпляну і ВСНГ і контр-рэвалюцыйнымі нацдэмамі.

Цікава, як гэтыя ўсе контр-рэвалюцыянэры баяліся таго, каб працоўныя масы БССР выйшлі на шырокі шлях культуры, асьветы і навукі. Вось чаму яны, літаральна з зубоўным скрогатам і хлусьнёй сустракалі ўсе нашы заваёвы на шляху культурнага будаўніцтва. Вы ўсе ведаеце, з якім напружаньнем сіл партыя, улада і працоўныя масы БССР будавалі Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт.

Вялікадзяржаўныя шавіністы, шкоднікі в Дзяржпляну і ВСНГБ і контррэвалюцыйная нацдэмы, Шэйнін, Брэсьлер, Ластоўскі і Гарэцкі,—усе яны зышліся на тэй фармуле, што Беларусью магчыма гандляваць у раздроб і оптам.

Мне здаецца, што ў адносінах да групы спэцыялістаў, якія мараць аб «ураздзе інжынэраў», у нас ёсьць і павінен быць адзін адказ—гэта адказ, які сказан Максімам Горкім: **«што ў нас, калі вораг не здаецца, дык ворага зьнішчаюць».**

Я хачу выказаць, што сярод навуковых працаўнікоў Савецкай Беларусі значна пераважная большасьць ёсьць тых, хто ўпарта будзе працаваць, каб тут, дзе мы зараз знаходзімся, ніколі ня было той крывічанскай дзяржавы аб якой марылі Ластоўскія, каб тут ніколі ня было той дэмакратычнай калёніі Заходняга імпэрыялізму, якую рыхтавалі шкоднікі з Дзяржпляну і ВСНГБ (воплескі).

Тав. Позьняк

Некалькі год таму назад на Эльводзе мы мелі маленькія машыны. Зараз мы паставілі больш моцныя машыны, але ўсё-ж такі мы адстаем ад запатрабаваньняў нашай прамысловасьці, бо прамысловасьць расьце хутка і мы не пасьпяваем угнацца за ёю. Калі пашыраецца прамысловасьць, дык трэба аднолькава пашыраць і энэргетычную базу.

У некаторых калгасах ёсьць машыны, зробленыя на нашых заводах, але машыны ўвосень стаялі там у грязі недагледжаныя. Трэба больш уважліва адносіцца да машын.

Тав. Мацько

У разьвіцьці прамысловасьці—мы маем вялізарныя дасягненьні, але трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасьць работы. Па шэйнай прамысловасьці трэба было-б пажадаць на частцы якасьці шмат лепшага. Зьезд павінен даць дырэктывы новаму ўраду зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасьць прадукцыі нашай прамысловасьці. Мы павінны больш увагі аддаць нашаму плянаваньню.

Каштарысы на мясцох атрымліваюцца са спазьненьнем і раённыя арганізацыі, не чакаючы гэтых каштарысаў, пачынаюць будаўніцтва, але пасьля

палучэньня каштарысу атрымліваецца, што тое ці іншае мерапрыемства выкрэсьлена. Між тым гэтае мерапрыемства будуецца, на яго ўкладзены сродкі і ўсё гэта ляжыць мёртвым капіталам. Трэба каб НКФін прыняў усе захады да таго, каб зараз усе каштарысы былі дасланы.

У Добрушы былі падрыхтаваны будаўнічыя матар'ялы для будаўніцтва сямігодкі, але зараз на каштарысу гэта будаўніцтва выкрэсьлена. У Рагачове пачалі будаваць майстэрню. Уклалі ў гэтую справу шмат сродкаў, а потым пачалі будаваць у другім месцы. Тут ёсьць рука шкоднікa, інакш нельга кваліфікаваць такія дзеяньні.

Тав. Аноцкі

(Клімавіцкі раён).

Для практычнага ажыцьцяўленьня ўзмацненьня сельсаветаў неабходна паставіць пытаньне так, каб ня толькі старшыні і сакратароў сельсаветаў прапускаць праз доўгатэрміновыя і кароткатэрміновыя курсы, але і асобных членаў сельсаветаў.

У нас надзвычайна дрэнна стаіць справа прасоўваньня таварыў ад прамысловасьці да спажыўца.

Тав. Нартыш-Блук

Усім відавочна, што культурна-гаспадарчы рост Савецкай Беларусі ідзе шпаркімі тэмпамі. Мы маем значныя дасягненьні ў будаўніцтве прамысловасьці і ў перабудове сельскай гаспадаркі.

Вяжейшай справай, якая павінна быць намі вырашана ў бліжэйшы час—гэта забясьпячэньне кармамі нашых жывёлагадоўчых гаспадарак і калгасаў. Усім відома, што справа з забясьпячэньнем кармамі жывёлы ў раёнах пагражаючае. Нам прыдзецца на зьезьдзе вызначыць рад канкрэтных мерапрыемстваў, якія неабходна ажыцьцявіць у бліжэйшы час. Трэба ў першую чаргу ўзяць на строгі вучот кармы, якія маюцца ў кожным саўгасе і калгасе.

Нам трэба паставіць пытаньне так, каб кожны дэлегат гэтага зьезду, будучы на вёсцы, альбо ў горадзе, добра ведаў і назіраў за тым, як праводзяцца дырэктывы зьезду на мясцох, каб ён прыняў на мясцох усе рашучыя меры да зьнішчэньня ўсіх тых недахопаў, якія сёньня вызначыў у сваім дакладзе т. Галадзед.

тав. Пракоп'ева

У нас ёсьць вялікі недахоп—гэта тое, што цягнікі ўвесь час позьняцца. Трэба зьвярнуць увагу на палепшаньне работы нашага чыгуначнага транспарту.

Прамова прэзыдэнта Беларускай Акадэміі Навук тав. Горыха

Я думаю, што няма патрэбы даказваць вялікае гістарычнае значэньне X Усебеларускага Зьезду Саветаў, які сабраўся ў трэці рашаючы год пяцігодкі, калі перад намі пастаўлена задача завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Бязумоўна, гэтыя рашэньні зьезду будуць мець гістарычнае значэньне і для Беларускай акадэміі навук. Беларуская акадэмія навук на вялікі жаль ня можа яшчэ заяўіць X Зьезду, як гэта заявіў выступаўшы ўчора дэлегат ад Гомельскага заводу «Пралетары», што яна сайшла ўжо з чорнай дошкі і атрымала Чырвоны Сьцяг. Усім, мабыць, вядома, што Беларуская акадэмія навук, стаўшы асяродкам контррэвалюцыйнай дзейнасьці нацыянал-дэмакратаў па заслугах выклікала вялікае абурэньне савецкай грамадзкасьці. У сучасны момант БАН перажывае рашучы пералом і імкнецца, змыўшы сваё ганебнае мінулае, актыўна ўключыцца ў агульнае русло сацыялістычнага будаўніцтва. Дазвольце таму ад імя новага кіраўніцтва і асноўнай групы работнікаў БАН запэўніць X Зьезд, што мы прыложым усе сілы, каб БАН сапраўды выканала задачы, пастаўленыя перад ёй К стрычнікавай рэвалюцыяй і сучаснай барацьбой пралетарыяту і бяднацка - серадняцкіх мас сялянства (воплескі).

Мы ведаем, што для таго, каб прыняць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, нам неабходна будзе бязь літасна выкрыць памылкі мінулай работы БАН і памылкі яе старога кіраўніцтва. Асноўная памылка мінулай работы БАН заключалася ў тым, што яна імкнулася застацца ў баку ад сацыялістычнага будаўніцтва і тым самым дазволіла нацыянал-дэмакратычным элементам выкарыстаць Акадэмію для іх контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці. Прапаганда так званай «аб'ектыўнасьці навукі» для контр - рэвалюцыйных элементаў Акадэміі ў сапраўднасьці была толькі шырмай, прыкрываючай рэакцыйныя мэты нацыянал-дэмакратаў. У моц такой палітыкі мінулага нацыянал - дэмакратычнага кіраўніцтва БАН, Акадэмія не змагла стаць сапраўдным цэнтрам беларускай культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па сваім зьместу і не вяла барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам. Мінулая дзейнасьць БАН з надзвычайнай пераканаўчасьцю паказвае, якое важнае значэньне нацыянальнае пытаньне набывае ў рэканструкцыйны пэрыяд. Патрэбна з усёй катэгарычнасьцю заявіць: той не баль шавік, — хто не праводзіць правільнай Ленінскай палітыкі ў нацыянальным пытаньні. Толькі пры правільным правядзеньні Ленінскай нацыянальнай палітыкі — у бязьлітаснай барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе і ў барацьбе з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал - шавінізмам другіх нацыянальнасьцяй мы сапраўды зможам выканаць задачы, пастаўленыя перад намі Кастрычнікавай рэвалюцыяй.

Патрэбна сказаць, што барацьба з ухіламі ад Ленінскай нацыянальнай палітыкі яшчэ далёка не закончана. Некаторыя таварышы думаюць, што з арыштам групы контр-рэвалюцыйных нацдэмаў быццам-бы ўжо скончылася барацьба з нацыянал - дэмакратызмам. Гэта зусім ня так. Барацьба з вялікадзяржаўным шавінізмам і нацыянал-дэмакратызмам яшчэ ня скончана, бо яшчэ зусім ня зьнішчаны сацыяльныя карані, якія харчуюць гэты ўхіл. Каранi-ж ухілаў ад Ленінскай нацыянальнай палітыкі ляжаць у наліччы рэштак раней пануючых клясаў, кулацтва, і яшчэ ня зусім зьнішчанай буржуазнай ідэалёгіі. Сапраўды, досыць пераглядзіць творы Янкі Купалы, Якуба Коласа і інш. нацдэмаўскіх пісьменьнікаў, каб убачыць, што ўсе яны зьяўляюцца песьнярамі кулацтва і выконваюць сацыяльны заказ сельскае буржуазіі. Ва ўмовах БССР іх кулацкая ідэалёгія прыкрывалася нацыянальнай формай, але кулацкая сутнасьць іх такая-ж кулацкая, як у Кандрацьевых, Чаянавых у РСФСР, Яворскага на Украіне і г. д. Кулацтва, як вядома, зьяўляецца апошнім апорай контррэвалюцыі ў нашым СССР. Не выпадкова таму, што кулацтва бярэцца пад абарону, як імпэрыялістаў, так і белагвардзейскай эміграцыі да трацкістаў уключна. Як бачым, варожыя настроі супроць пралетарыяту выходзяць з пластоў варожых сацыялізму, якія ўзмацняюць дробна - буржуазныя рэакцыйныя забабоны, што быццам бяднякі - серадняцкія масы сялянства могуць палепшыць сваё становішча на базе кулацкай аднаасобнай гаспадаркі. У сапраўднасьці-ж гэтыя тэорыі выгодны толькі кулацтву і скрыстоўваюцца ім для эксплёатацыі асноўнай бяднякі - серадняцкай масы сялянства. Як вядома, кулацтва выступае самым заядлым ворагам калгасаў і саўгасаў і ў сваёй барацьбе супроць іх не ганьбуе ніякімі мерамі. Адмак, ня гледзячы на шалёную кулацкую агітацыю, асноўныя бяднякі-серадняцкія масы сялянства ў нашым СССР беспаваротна павярнулі на новыя формы арганізацыі сельскае гаспадаркі. Яны разумеюць, што ў сацыялізм ня ўедзеш ня толькі на ўласным кані, але і на тройцы і што толькі ў рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і разьвіцьці калгаснага будаўніцтва асноўны выхад, які можа вывесьці бяднякі - серадняцкія масы сялянства з жабрацтва і цемры. Гэтага не разумеюць апартуністы ўсіх колераў, як часта не разумеюць і таго, што вывесьці сялянства з жабрацтва і цемры можна толькі пад кіраўніцтвам пралетарыяту.

Партыя бальшавікоў заўсёды адзначала, што задачы Кастрычнікавай рэвалюцыі могуць быць выкананы толькі ў саюзе пралетарыяту з асноўнымі бяднякі - серадняцкімі масамі сялянства. Гэтае пытаньне стаяла ў цэнтры ўвагі партыі на кожным этапе і яно ня можа ня быць у цэнтры ўвагі і ў нашы дні. Як вядома, аснова, на якой заснаваўся фактычны саюз пралетарыяту і сялянства, ў розныя гістарычныя пэрыяды была рознай. Для таго, каб ажыцьцявіць задачы рэканструкцыйнага пэрыяду, мы таксама павінны чтка ўсьвядоміць, на чым-жа грунтуецца сучасны саюз пралетарыяту і асноўных бяднякі - серадняцкіх мас сялянства і што сапраўды гарантуе нам за вырашэньне задач Кастрычнікавай рэвалюцыі, гэта значыць поўнай пабудовы сацыялізму .Такой асновай саюзу пралетарыяту і сялянства ў нашы дні зьяўляецца **індустрыялізацыя**, ад посьпеху правядзеньня якой залежыць і моц саюзу пралетарыяту і асноўных бяднякі - серадняцкіх мас. Нажаль, гэтага шмат хто яшчэ не разумеюць, як не разумеюць, што паслабленьне тэмпаў індустрыялізацыі на справе вядзе да паслабленьня саюзу пралетарыяту з асноўнымі бяднякі - серадняцкімі масамі сялянства.

На розных гістарычных этапах фор-

мы змычкі пралетарыяту з сялянствам былі розныя. Калі мы возьмем пэрыяд 1917 году, дык убачым, што моцным цэмэнтам, спаяўшым пралетарыят з сялянствам, было нездавальненьне мас імпэрыялістычнай вайной і барацьба за канфіскацыю абшарніцкіх зямель. У гады грамадзянскай вайны саюз пралетарыяту і сялянства мацнеў у супольнай барацьбе па абароне заваёў Кастрычнікавай рэвалюцыі. Ва ўстаноўчы пэрыяд гэты саюз шоў па лініі абмежаваньня кулацтва і дапамогі з боку пралетарыяту ў здавальненьні ўласных патрэб сялянства. Зараз-жа, калі матар'яльны ўзровень асноўных бяднякі-серадняцкіх мас на старых формах аднаасобнай гаспадаркі ня можа ўжо далей разгортвацца, гісторыя ва ўвесь рост паставіла задачу неабходнасьці пераходу сельскае гаспадаркі на новыя сацыялістычныя формы. У моц гэтага праблема індустрыялізацыі краіны ў справе ўзмацненьня саюзу пралетарыяту з асноўнымі бяднякі - серадняцкімі масамі сялянства, мае рашаючае значэньне. Выступаўшы перад мной т. Арашчук, як вядаць, шчыра адданы камуністычнай партыі і савецкай уладзе, ў той-жа час скардзіўся на наліччы розьніцы паміж горадам і вёскай. Ён, мабыць, адбіваў ня толькі свае ўласныя настроі. І ў адказ на яго заяву мы павінны сказаць, што іменна індустрыялізацыя краіны здольна канчаткова зьнішчыць розьніцу паміж горадам і вёскай, розьніцу, якая зьяўлялася няўхільным вынікам капіталістычнага разьвіцьця. Ад посьпеху нашае індустрыялізацыі залежыць зьнішчэньне спадчыны, атрыманай намі ад капіталізму. Вось чаму сялянства, ня менш чым пралетарыят зацікаўлена ў пасьпяховых і шпаркіх тэмпах індустрыялізацыі.

Аб магутнай ролі індустрыялізацыі і неабходнасьці шпаркіх тэмпаў яе разьвіцьця асобную ўвагу зьвяртаў яшчэ тав. Ленін, які ў сваім нарысе пляну артыкулу аб падатку ў красавіку—маі 1921 году пісаў.

«Калі электрыфікацыя праз 10—20 год, ніколькі ня страшны індывідуалізм дробнага зямляроба і вольны ган даль яго ў мясцовым звароце. Калі не электрафікацыя, усё роўна няўхільны зварот да капіталізму. 10—20 год правільных суадносін з сялянствам і забясьпечана перамога ў сусьветным маштабе (нават пры затрымцы пралетарскіх рэвалюцый) інакш 20—40 год зьдзекаў белагвардзейскага тэрору» (Лен. Зб. IV, стар. 374).

У геніяльным нарысе пляну брашуры аб падатку тав. Ленін чотка фармуляваў, якое значэньне мае для нас індустрыялізацыя краіны. Пасьпяховая індустрыялізацыя краіны ёсьць гарантыя ад капіталістычнага прынчэньня, якому мы можам падпасьці, калі ня справімся з задачамі індустрыялізацыі. Тав. Сталін, як верны вучань Леніна, неаднаразова зварочваў увагу на значэньне індустрыялізацыі і выразна сфармуляваў, якія адносіны павінны быць установлены паміж пралетарыятам і сялянствам у рэканструкцыі гаспадаркі БССР. У якасьці бліжэйшай задачай БАН павінна будзе заняцца распрацоўкай праблемы генэральнага пляну народнае гаспадаркі БССР. Для таго-ж, каб БАН магла сапраўды справіцца з гэтай задачай, неабходна самая шчыльнейшая ўвязка работы БАН з нашымі культурнымі, грамадзкімі і гаспадарчымі арганізацыямі. Толькі непасрэдна ўдзельнічаючы ў штодзённым сацыялістычным будаўніцтве, БАН зможа весьці распрацоўку агульна-тэарытычных праблем, бо марксысцкая тэарытычная работа заўсёды базыруецца на вывучэньні канкрэтнай сапраўднасьці

Трэба адзначыць, што ў справе выкананьня сваіх задач Акадэмія на першых часох сустрэнецца з цэлым радам труднасьцяй, якія мы адкаж спадзяёмся пасьпяхова перамагчы—гэта саматужніцт

ПЕРАТВОРЫМ РАПАРТ МІЛЬЕНАЎ Х ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ ВА УСЕБЕЛАРУСКІ ПАХОД

ЗА УДАРНАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ

Узьнімем мільённыя масы ў бой за суцэльную калектывізацыю і на яе аснове ліквідацыю кулацтва як клясы

„Наперадзе пойдуць савгасы, як станавы храбет перабудовы старога ўкладу вёскі. За імі пацягнуцца шматлікія калгасы, як апорныя пункты новага руху ў вёсцы. Злучаная работа гэтых двух сыстэм стварае ўмовы для поўнай калектывізацыі ўсіх вобласьцяй СССР“. (СТАЛІН)

1200 трактараў—другой бальшавіцкай вясьне

У вясну г. г. на палёх Савецкай Беларусі загудзе сталёвая копыніца—тысячы трактараў. Замест аднэй Койданаўскай МТС у мінулым годзе, сёлета арганізуецца 27 МТС: 23 МТС ужо арганізаваны, вядзецца падрыхтоўка да арганізацыі яшчэ 4 МТС.

У працэсе сваёй работы МТС будуць абслугоўваць калгасы і прасьцейшыя вытворчыя аб'яднаньні па прынцыпу камбінаванага выкарыстаньня трактарнай цягі, складаных машын, арыладаў МТС, жывой цягавай сілы і інвэнтару калгасаў.

23 арганізаваныя МТС павінны ахапіць у працэсе сваёй работы ў час веснавой сяўбы плошчу 213.300 га пры выкананьні ўсяго гадавога пляну 1931 году 466.700 га пахаці. У час веснавой сяўбы МТС паплюць на палі 1.200 трактараў. Да 1-I—31 г. МТС БССР мелі ўсяго 357 трактараў, да восені-ж г. г. МТС будуць мець ня менш 1.420 трактараў.

Зараз пачынаецца вялізарная работа па будаўніцтву МТС. Капітальныя ўкладаньні на сёлетні год вызначаны ў разьмеры 6.930.000 руб. Да гэтага часу ужо адведзены зямельныя вучасткі для МТС і амаль ўсюды замацаваны. Зараз трэба шырока разгарнуць работу да будаўнічага сэзону. На вучастках работы маецца рад недахопаў, якія перашкаджаюць нармальнаму ходу падрыхтоўкі да будаўніцтва. Да гэтага часу ня высьветлена, як будзе адпушчана цэгла і колькі яе будзе адпушчана; у некаторых раёнах, (Копыльскі і інш.) слаба праходзіць загатоўка лясных матар'ялаў. Трэба зараз-жа чотка арганізаваць усю работу па падрыхтоўцы да будаўніцтва МТС. Трэба так арганізаваць падрыхтоўчую работу, каб забясьпечыць поўнае выкананьне пляну гэтага году.

Другім ня менш важным пытаньнем зьяўляецца правільнае і своячасовае правядзеньне дагаворнай кампаніі. Зараз у нас павінна шырока разгарнуцца дагаворная кампанія паміж МТС і калгасамі. Гэтая кампанія мае выключнае значэньне. Кожны заключаны дагавор МТС з калгасам—гэта ўдар па кулаку і яго агітацыі супроць калектывізацыі. На 20-га лютага ўжо заключаны дагаворы з 509 калгасамі, з якіх 55 недаўна арганізаваліся аб'яднаньня 2.515 гаспадарак. Дагаворы заключаны на 96.380 га, што складае 45,2 проц. пляну. Калі ўзяць пад увагу позняе ўкамплектаваньне МТС патрэбнымі кадрамі, бязумоўна мы маем тут пэўнае дасягненьне.

Зразумела, што нельга застанавіцца на гэтых дасягненьнях. Трэба яшчэ шырэй разгарнуць дагаворную кампанію. Ня трэба забываць аб тым, што заключаючы дагавор з калгасам, мы змагаемся за новыя тысячы калгасьнікаў, мы змагаемся за плян, за суровы вучот нашай работы, мы змагаемся супроць стыхіі дробнай сялянскай гаспадаркі.



Рамонт трактара ў калгасе «Пралетарыі».

Адным з баявых вучасткаў МТС да вясновай сяўбы, зьяўляецца своячасовае скончаньне рамонту. Тут таксама мы маем пэўныя посьпехі: з 516 пашсаваных трактараў, ужо адрамантаваны 214, ці 41,7 проц. пляну. Тыя 4—5 тыдняў, якія засталіся да пачатку палявых работ, трэба ўсямерна выкарыстаць на рамонт трактараў, каб выйсьці ў поле са спраўнымі машынамі. Трэба дабіцца поўнай нагрузкі рамонтных майстэрняў, трэба належна арганізаваць і самую работу гэтых майстэрняў.

На арганізацыю і будаўніцтва МТС павінна быць зьвернута належная ўвага ўсёй нашай партыйнай і савецкай грамадзкасьці.

Трэба зьнішчыць усе перашкоды на шляху стварэньня магутных калён, сталёвых машын—МТС.

І—ч.

Вытворчае каапэраваньне—баявая задача веснавой сяўбы

Сыстэма жывёлагадоўчай каапэрацыі ў асобным квартале выканала плян вытворчага каапэраваньня ўсяго на 23 проц. і мабілізацыі сродкаў на 22 проц. За студзень месяц выканана заданьне першага кварталу па каапэраваньні на—0,5 проц., і па мабілізацыі сродкаў—0,4 проц., Такія тэмпы не адпавядаюць тым тэмпам, якія вызначаны дырэктывамі аб вытворчым каапэраваньні.

Студзеньскі Пленум ЦК КП(б)Б рашуча асудзіў меўшую месца недаацэнку ролі вытворчых каапэрацыйных аб'яднаньняў, як з боку асобных цэнтральных ведамстваў, так і раду раённых мясцовых арганізацый, пленум прапанаваў Наркамзему, фракцыі сыстэм с.-г. каапэрацыі, раённым і мясцовым партарганізацыям дабіцца таго, каб на працягу 1931 году асноўная маса бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, што не ўвайшла яшчэ ў калгасы, была ахоплена вытворчымі каапэраваньнямі.

Сыстэма жывёлагадоўчай каапэрацыі павінна ў аснову сваёй работы паставіць, як адну з першачарговых задач,—вытворчае каапэраваньне бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, а не праяўляць пасыўнасьці ў гэтай работе. Трэба ўсёй сыстэме яскрава зразумець, што, праводзячы вытворчае каапэраваньне, стварачы сыстэму першапачатковых вытворчых аб'яднаньняў, гэтым самым яны ствараюць магчымасьць своячасовага выкананьня ўсіх палітычна-гаспадарчых задач па перабудове сельскай гаспадаркі на сацыялістычныя рэйкі. Існуючы ў сучасны момант мэтад работы ня можа задаволіць тыя задачы, якія пастаўлены партыяй і ўрадам перад сыстэмай у справе рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і выкананьня гаспадарча-палітычных задач.

Дырэктыва Пленуму ЦК абавязвае сыстэму напружыць усю ўвагу на вытворчае каапэраваньне. Выходзячы з даденых дырэктыў, Райкаапсаюзы павінны паставіць гэта пытаньне перад мясцовымі арганізацыямі, згрупаваўшы ўвагу апошніх на вытворчым каапэраваньні бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, мабілізаваць вакол гэтага пытаньня грамадзкасьць, недапушчаючы ў гэтай рабоце зьніжэньня тэмпаў.

Прычыны зьніжэньня каапэраваньня інакш нельга растлумачыць, як толькі бязьдзейнасьцю сыстэмы.

Жывёлагадоўчая сыстэма падыходзіць да правядзеньня веснавой сяўбы. Кантрактацыю яравых пасеваў і іншыя веснавыя работы трэба ўвязаць з вытворчым каапэраваньнем; трэба стварыць сетку першапачатковых аб'яднаньняў на аснове правядзеньня кантрактацыі з паселішчамі, групамі пасеўчыкаў, арганізацыі злучных пунктаў, зернаачышчальных абозаў. Усё гэта ёсьць адзін з магутных рычагоў калектывізацыі і вытворчага каапэраваньня, арганізацыя новых першапачатковых т-ваў і ўзмацненьне работы існуючых таварыстваў.

Веснавая сяўба, вакол якой мабілізуецца грамадзкасьць вёскі, дасьць магчымасьць выканаць дырэктывы партыі і Ўраду па вытворчым каапэраваньні. Гэта пытаньне ва ўсю шырыню трэба ставіць на сходах груп беднаты, вясковага актыву, праводзячы жорсткі клясавы падыход, даючы рашучы адпор кулаку.

Жывёлагадоўчая сыстэма на даным этапе павінна адыграць вялікую ролю ў справе падрыхтоўкі да калектывізацыі сельскай гаспадаркі. На аснове вытворчага каапэраваньня трэба ўводзіць у першапачатковае таварыства элементы абагуленьня, а ўлэсна: арганізацыю абагуленых сьвінарнікаў, кароўнікаў з пастаноўкай у іх статку, адкормачных апэрацый, арганізацыі супольнай апрацоўкі глебы, злучных пунктаў і г. д. Фарсіраваньне арганізацыі абагуленых элемэнтаў, якія спрыяюць хутчэйшаму пераходу першапачатковых т-ваў у вышэйшую ступень—калгас, а таксама і пераводу існуючых т-ваў у калгасы—адна з асноўных работ сыстэмы ў вясновую пасеўную кампанію.

Сыстэма жывёлагадоўчай каапэрацыі павінна сапраўды па-бальшавіцку, па-баявому ўзяцца за выкананьне дырэктыў партыі і ўраду па каапэраваньні.

Журомскі.

На вечары-мітынгу

Узмацняем дружбу з аднаасобнікамі—бядняком і серадняком

Калгас «Пралетарскі барэц», Навасельскага с.-с., падыходзіць да Х Усебеларускага зьезду Саветаў з вялікімі дасягненьнямі. Ён зьяўляецца адным з лепшых калгасаў ў раёне.

На ўсіх відах загатовак плян калгасам выкананы поўнасьцю. У той час, калі большасьць калгасаў Барысаўскага раёну здалі менш, чым 16 проц. заданьня па лёназагатоўках, «Пралетарскі барэц» выканаў заданьне на 100 проц.

Своячасова калгас стаў рыхтавацца да веснавой сяўбы. Ужо ачышчана цалкам насеньне: засыпаны страхавыя і насенныя фонды, адрамантаваны інвэнтар, складзены брыгады для надыходзячых вясеньніх работ. Нагул, бярэцца курс на чоткае разьмеркаваньне абавязкаў, што павысіць яшчэ больш арганізацыю працы, якая, дарэчы кажучы, у калгасе і так добра наладжана.

Калгас увязвае ўсе палітычна-гаспадарчыя кампаніі з новым прылівам. За апошні час у калгас улілося 29 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. 1-га лютага калгас, сьвяткуючы гадавіну свайго існаваньня, арганізаваў мітынг-вечарыну з удзелам 320 чал. У час мітынгу, пасьля падвядзеньня вынікаў праробленай за год работы, ў калгас уступіла 8 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і 4 калгасьнікі падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

Калгас «Пралетарскі барэц» яшчэ больш мабілізуе сябе для выкананьня задач, якія пастаўлены партыяй і ўрадам, яшчэ больш будзе змагацца супроць абнаглеўшага кулака, уцягваючы ў сваі рады аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў.

Ф.

Балоты—у квітнеючае поле

Мэліярацыйнае будаўніцтва ва ўмовах БССР мае асаблівае значэньне. З боку дзяржавы гэтай галіне гаспадаркі ўвесь час зварачваецца значная ўвага. Мільёны сродкаў штогодна ўкладаюцца ў гэтую справу для пашырэньня годных зямель, для падрыхтоўкі сельска-гаспадарчага асваеньня вялікіх балотных масываў. Задачы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі значна павялічылі асыгнаваньні на мэліярацыю і паставілі канкрэтна пытаньне ня толькі своячасовага і поўнага выкананьня плянаў мэліярацыі, але і якаснага палепшаньня гэтай работы (усебакова комплексное вышуканьне, падрыхтоўка балотных масываў для арганізацыі буйных сацыялістычных гаспадарак з спэцыяльным напрамкам і інш.). Адсюль лаўстае пытаньне больш цьвёрдай плянавасьці і ўзмацненьня кіраўніцтва мэліярацыйным будаўніцтвам пад пунктам погляду больш рацыянальнага скарыстаньня ўкладаемых сродкаў, своячасовага і поўнага выкананьня плянаў работ.

Зьвярнемся зараз да таго, як выкананы плян па мэліярацыі за мінулы год. Падагульваючы вынікі за мінулы год, прыходзіцца канстатаваць, што плян мэліярацыі амаль сарваны, што гэтыя работы выкананы ня больш, як на 50 проц. Тлумачыцца гэта радам прычын: адсутнасьцю сталага кіраўніцтва з боку цэнтральных устаноў, дрэнтнай арганізацыі работ у мэліярацыйных таварыствах, адсутнасьцю грамадзкага кантролю над правядзеньнем работ незацікаўленасьцю ніжэйшых савецкіх, партыйных і камсамольскіх арганізацый і радам іншых прычын. Зараз трэба падумаць аб тым, каб належна падрыхтавацца да выкананьня плянаў мэліярацыйных работ на 1931 г., каб з гонарам выканаць і перавыканаць, данёсшы партыяй і ўладай, заданьні. Пакуль што ў гэтай галіне недастаткова робіцца; мэліярацыйныя таварыствы ў цэлым радзе раёнаў, з прычыны адсутнасьці кіраўніцтва, распадаюцца. Калі на гэтую вельмі важную галіну работы ня будзе зьвернута належная ўвага калі каапэрацыйна-калгасныя арганізацыі ня будуць належна абслугоўваць мэліярацыйныя т-вы, можа стварыцца пагроза зрыву работы па т-вах.

Зараз трэба завастрыць увагу на пытаньні правільнага разьмяшчэньня рабочых вучасткаў. Мэліятрэст арганізаваў рад вучасткаў, паміж якімі некаторыя тэрытарыяльна ня ўдала разьмешчаны; каб папасьці часам на аб'ект работы трэба зрабіць 30—35 кілм. па вельмі дрэнтай дарозе. Бязумоўна, што такая раскіданасьць аб'ектаў работ будзе ускладняць кіраўніцтва і кантроль за выкананьнем мэліярацыйных заданьняў.

Трэба таксама ўстанавіць па лініі калгасна-каапэрацыйных устаноў адказных інструктароў па арганізацыі мэліярацыйных работ (ня менш 1 на раён).

Мэліятрэсту НКЗ трэба наладзіць жывую сувязь і інструктаваньне вучасткаў. Неабходна мабілізаваць грамадзкую думку і арганізаваць кантроль над усім работамі і прыцягнуць увагу партыйных, савецкіх і камсамольскіх арганізацый вакол гэтых задач.

Неабходна зрабіць праз друк пераклічку будаўнічых вучасткаў, ў якой трэба асьвятляць недахопы і дасягненьні ў рабоце.

Камсамольскія арганізацыі павінны ўзяць шэфства над выкананьнем буйных мэліярацыйных работ. Бешанковіцкі будаўнічы вучастак трэба рэарганізаваць, зьліўшы апошні з Віцебскім і Полацкім вучасткамі.

Толькі пры мабілізацыі грамадзкай думкі і належным разьвіцьці мэтадаў ударніцтва і спаборніцтва ў справе мэліярацыі можна будзе дабіцца выкананьня плянаў мэліярацыйных работ на 1931 год.

Т—ч і С—ч.

Стаім на пераможным шляху

(Калгас «Бязбожнік», Вушацкі раён).

Ня гледзячы на ўсе няжкасьці, якія стаялі перад калгасам «Бязбожнік» першы гаспадарчы год калгасу закончыўся з посьпехам. У калгас уступілі на працягу году 16 новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Плошча калгас павялічылася з 270 га да 700 га.

Калгасьніца калгасу «Кавалі» Хамец У. Удзельніца савецкай эстафэты. Каралінскі раён.

Ураджай ў калгасе атрымаўся значна больш чымся ў індывідуальным сэктары, бо ўся ярына пасеяна была гатункавым насеньнем.

У выніку гэтага калгас мае валавы прыбытак у 25000 р., пры чым сярэдні за работак калгасьніка складае 400 руб.

Зараз у калгасе заканчваецца сьвінарнік на 100 сьвіноматак, загатаўляюцца матар'ялы на пабудову аборы на 200 галоў кароў.

Новы склад праўленьня абраны з 5 асоб, у склад якога ўвайшлі 2 партыйцы, 1 батрачка, 1 жанчына-сераднячка.

Арганізавана група беднаты, якая прымае ўдзел у вырашэньні важнейшых пытаньняў калгаснага жыцьця.

У калгас паступіла каля 8 заяў аб прыёме ў калгас. На вясну калгас будзе будаваць некалькі кватэр для ўноў уступаючых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Брыгадзір газэты «Сав. Беларусь». А.

Клясавага ворага—мятлой з калгасу

Жорсткай самакрытыкай у часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі калгасьнікі выкрылі кулацкую зграю

Калгас «Вольная праца» — пас. Румина, Аршанскага раёну — арганізаваўся ўвесну мінулага году з 16 бядняцка - серадняцкіх гаспадарак. Ня гледзячы на тое, што калгас меў магчымасьць пашырыцца за кошт заколічнай беднаты і серадняцтва, ён гэтага росту не дабіўся. За час свайго існаваньня ў калгас уступіла толькі адна гаспадарка. Пры гэтым тры гаспадаркі выступілі з калгасу. Такім чынам замест росту калгас меў адліў.

Чым-жа гэта тлумачыцца?

У часе перавыбараў праўленьня гэтага калгасу, што нядаўна адбыліся і прайшлі пры шырока разгорнутай крытыцы і самакрытыцы, было выкрыта сапраўднае становішча калгасу і ўсе яго балячкі. Праўда, у сваёй справаздачы праўленьне калгасу імкнулася замазаць хворыя бакі і давесьці калгасьнікам нібы ў калгасе ўсё стаіць добра. Аднак, калгасьнікі ня гледзячы на гэта рашуча выявілі недахопы ў рабоце праўленьня.

У спрэчках выявілася, што старшыня калгасу Гаўрушчанка працаваў так, каб палепшыць становішча не калгасу а кулакоў. Гаўрушчанка ў час раскулачваньня і высяленьня кулакоў, захоўваў жывёлу і рэчы кулака Кунінскага—свайго зяця — з тым, каб гэтая маемасьць ня трапіла ў калгас.

Перад уступленьнем у калгас Гаўрушчанка разбазарыў сваю жывёлу і ў калгас уступіў толькі таму, што яму патрэбна было пазбавіцца ад індывідуальнага абкладаньня. Гаўрушчанка будучы старшынёй праўленьня калгасу нават паклапаціўся вярнуць з высылкі аднаго кулака і «арганізаваў» яму ў калгасе «цёплае месца».

Бацька Гаўрушчанкі, кулак, жывучы ў калгасе, увесь час пагражае:

— Датуль не памру пакуль не адпомшчу калгасу за высяленьне майго зяця Кунінскага.

Ня дзіва што калгас апынуўся перад рэальнай пагрозай развалу, бо Гаўрушчанка і іншыя кулакі кіруючы калгасам увесь час імкнуліся разбурыць калгас.

У калгасе панавала поўная безгаспадарчасьць. Калгас нявыконвае сваіх абавязкаў перад дзяржавай: ён не выяжджаў на вывазку лесу, бо кулакі ўвесь час агітуюць калгасьнікаў супроць гэтых мерапрыемстваў.

Да гэтага часу калгас ня скончыў малацьбу ня зьмяў лёну і ня здаў яго дзяржаве.

У калгасе ёсьць дастаковая колькасьць машын, але яны на 90 проц. нягодныя бо захоўваліся вельмі безгаспадарча.

Да гэтага часу калгас не пачаў яшчэ падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Кантрольныя лічбы атрыманы ўжо даўно але аб іх упярэдняю загаварылі толькі ў часе перавыбараў.

Усё гэтыя недахопы, якія мелі месца ў рабоце калгасу, атрымаліся па віне кулакоў і абанкроціўшагася праўленьня, кулакі агітавалі супроць калектывізацыі, за развал калгасу. У выніку гэта і зьявілася прычынай адсутнасьці далейшага росту калгасу.

Усё гэта дзякуючы шырокага разгарнуўшайся крытыцы і самакрытыцы выявілася на перавыбарчым сходзе. Гаўрушчанка ў праўленьне ўжо не абраны але яму і ўсёй яго кулацкай зграе павінна быць месца і ў калгасе.

Горкі вопыт калгасу «Вольная праца» выразна гаворыць аб тым, як кулацтва прабраўшыся ў калгасы, імкнецца разбурыць іх і як хітра ўсё гэта робіцца.

Шкодная работа кулакоў у калгасе «Вольная праца» працягваецца ўжо цэлы год, але ні сельсавет, ні Райкалгасаюз да перавыбараў нічога аб гэтым ня ведаў. Гнойнік выкрылі сам калгасьнікі, шырока разгарнуўшы крытыку і самакрытыку ў часе перавыбарчага сходу.

Кудрын.

Посьпехі калгасу

вабяць аднаасобнікаў беднякоў і сераднякоў

У жніўні мінулага году ў в. Уці, Церахоўскага раёну, быў арганізаваны калгас «Бальшавік», у які ўвайшло 26 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Кулакі і іх агенты арганізавалі шалёную кампанію за развал калгасу. Пачалі распаўсюджваць розную хлусьню. Беднята не паслухала кулацкіх агентаў.

У адказ на кулацкую правакацыю, калгасьнікі пачалі будаваць новае жыцьцё. Сяўбу жыта калгас скончыў раней за паасобныя гаспадаркі на 10 дзён. Жыта засеялі 47 га, узаралі пад зяб 42 га

Каб жылі ў паасобку, дык селялі-б жыта аж да замаразкаў і засеялі-б толькі 21 га, а пад зяб нічога не заралі-б казалі калгасьнікі, хвалячыся сваімі дасягненьнямі. Калектыўная работа калгасу паказала перавагу буйнай калгаснай гаспадаркі перад дробнай аднаасобнай. З гэтага часу беднякі, а за імі і лепшыя сераднякі пашлі ў калгас. Пасьля справаздачы праўленьня 9 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак падалі заявы аб уступленьні ў калгас. Цяпер калгас яднае, акрамя гэтых 9, 63 гаспадаркі.

Калгас рыхтуецца да другой бальшавіцкай вясны. Праводзіцца зернаачышчэньне, ствараюцца насенныя фонды, пачаўся рамонт сельска-гаспадарчых машын.

Як толькі сойдзе сьнег, калгас будзе садзіць 20 га саду, прышчепы ўжо ёсьць.

Вось такія посьпехі калгасу «Бальшавік» вабяць новых членаў, няма таго дню, каб беднякі і сераднякі ня ўступілі ў калгас.

Селькор А. Мішчанка.

Сеяць здаровым чыстасортным насеньнем

Узьняць барацьбу з сажай

Ад сажы (хвароба расьлін) мы маем страт штогод сотні мільёнаў руб. Зараз, калі ў нашай краіне праводзіцца вялізарнае будаўніцтва ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры, малі ўжо на справе ажыцьцяўляецца будаўніцтва сацыялізму, нельга больш цярпець гэткіх страт, тым больш, што гэты чужаед вывучаўся ўжо больш за 50 год і добра вывучаны. Усесаюзны інстытут па абароне расьлін у пачатку студзеня 1931 г. склікаў у Ленінградзе канфэрэнцыю з тым, каб выпрацаваць мерапрыемствы па ліквідацыі сажы ў гаспадарках сацыялістычнага сэктару.

Зьнішчэньне сажы па ўсёй тэрыторыі СССР можа быць дасягнута толькі пры плянавай пабудове і правядзеньні ў жыцьцё цьвёрдай сыстэмы мерапрыемстваў па барацьбе з гэтым чужаедам.

Асноўнай крыніцай распаўсюджваньня сажы зьяўляецца заражанае насеньне. Вось чаму сажа павінна быць зьнішчана перад высевам насеньня; павінен быць поўнасьцю пратручаны ўвесь пасеўны матар'ял матачных гадавальнікаў насенных гаспадарак.

Для таго, каб дабіцца хутчэйшага зьнішчэньня сажы ў тых гаспадарках, якія даюць таварнае збожжа, у такіх гаспадарках павінны быць арганізаваны насенныя кліны. Гэта спэцыяльна адведзеныя вучасткі, па магчымасьці ізаляваныя ад поля; матар'ял павінен быць поўнасьцю пратручаны. Насенныя кліны ў саўгасах і калгасах павінны быць адведзены ўвесну 1931 году.

Каб хутчэй атрымаць насенныя фонды, не заражаныя сажай, пратручэньне сэлекцыйнага насеннага матар'ялу трэба праводзіць мацнадзейнымі сродкамі.

Да гэтага трэба дадаць яшчэ такія моманты, як неабходнасьць дызэнфэкцыі тары с.-г. інвэнтара, збожжахавальніцкаў ня толькі у насенных і сэлекцыйных гаспадарках, але абавязкова ў таварных гаспадарках. У нашых умовах асноўным фунгісідам для пратручаньня аўсу, ячменю і проса, зьяўляецца фармалін, для пшаніцы і ячменю—сухія фунгісіды прэпарат «АБ», вугляжэлая медзь, парыская зеляніна і хромпік; што да апошняга, дык трэба проста сказаць, што гэты апарат вельмі шкодны і дае ня зусім добры эфэкт.

Да сяўбы засталося мала часу, але ні Наркамзем, ні Беларускае аддзяленьне Акц. Т-ва па барацьбе са шкоднікамі, нічога ня робяць па гэтым пытаньні. Трэба зараз-жа мабілізаваць усю савецкую грамадзкасьць вёскі (КСМ, ТДА-Авіяхэму і г. д.) вакол кампаніі па правядзеньні пратручваньня насеньня.

Трэба канстатаваць, што з боку паасобных работнікаў Наркамзему і АБВ няма належнай увагі да гэтага пытаньня.

Трэба даць рашучы адпор апартуністычнай стаўцы на самацёк.

Трэба зараз праверыць падрыхтоўку апаратуры, праверыць наяўнасьць насенных атрут.

Уся парука пасьпяховага правядзеньня кампаніі пратручваньня, як частка пасеўнай кампаніі, заключаецца ў тым, наколькі мы здолеем своячасова арганізаваць, расставіць сілы.

Гэта трэба рабіць сёньня, бо заўтра будзе позна.

Н. Дарожкін.

На шляху суцэльнай калектывізацыі

Калгасны рух па Крычаўскім раёне з кожным днём набывае ўсё большыя размахі.

На 10 лютага калгасамі ахоплена 22 проц. агульнага ліку бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну. Па асобных сельсаветах процант калектывізацыі дасягае ўжо значных разьмераў:

Бацьвінаўскі сельсавет калектывізаваны на 65 проц. Баеўскі—58 і Маляцінскі да 40 проц. Гэтыя тры сельсаветы вызначаны раённымі арганізацыямі, як сельсаветы суцэльнай калектывізацыі.

Масавы прыліў у калгасы назіраецца па Сакольніцкім і Вараноўскім сельсаветах, дзе процант калектывізацыі таксама даходзіць да 30.

Аб тым, наколькі шпарка адбываецца працэс калектывізацыі, сьведчаць наступныя лічбы: **на 1-га лютага калгасным сэктарам было ахоплена 19 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, на 10-га лютага—22 проц.** Параўнаўча шпаркі рост калектывізацыі ў раёне, асабліва ў памянёных вышэй сельсаветах, зьяўляецца вынікам правільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі ва ўсёй рабоце партыйных ячэек гэтых сельсаветаў.

Партыйная арганізацыя Крычаўшчыны ў асноўным рашуча змагаецца за выкананьне дырэктыў партыі аб захопе калгасамі 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак да пачатку веснавой сяўбы.

Сёньня калгасны рух дае гарантыю ў тым, што Крычаўскі раён будзе мець на вясну ня 30, а 40 проц. аб'яднаных у калгасы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Семянкоў.

12.500 руб. чыстага прыбытку

Калгас «Вызваленьне», Слуцкага раёну, Урэцкага сельсавету, арганізаваўся у 1927 годзе з 10 сем'яў яўрэйскай беднаты. Палова вучастку, які быў адведзены калгасу, патрабавала раскарчоўкі, але гэта не спалохала калгасьнікаў, большасьць якіх нават ня былі знаёмы з вядзеньнем сельскай гаспадаркі. У далейшым справа палепшаецца. У 1929 г. калгас атрымаў каля 2.000 руб. прыбытку.

У калгас пачаўся прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Зараз у калгасе налічваецца 27 работнікаў розных нацыянальнасьцяй.

Уборачная і асеньняя пасеўная кампанія прайшлі пасьпяхова. Хлебазагатоўкі калгас выканаў на 100 проц.

Гадовая справаздача за 1930 г. паказала, што калгас мае 12.500 р. прыбытку. Заслухаўшы справаздачу калгасу, у калгас запісалася 10 беднякоў і сераднякоў.

Магілевец.

Калгас імя Рэвваенсавету СССР

Зараз на Клімаўшчыне адбываецца вялікі прыліў у калгасы і арганізацыя новых калгасаў. Надовячы арганізаваны 2 новых калгасы: адзін імя VI-га раённага зьезду Саветаў і другі імя Рэвваенсавету СССР.

У калгас «Юны Камунар» улілося 30 новых гаспадарак, у калгас «Савецкая Беларусь»—41 гаспадарка, у калгас «Чырвоны Маяк» 13 гаспадарак. Клімаўшчына становіцца на шлях суцэльнай калектывізацыі.

Да Х Усебеларускага зьезду Саветаў

Створым сацыялістычныя фабрыкі мяса

У сваіх рашэньнях XVI партэзьезд прызнаў неабходным карэнным чынам перагледзець пяцігадовы плян разьвіцьця сельскае гаспадаркі з тым, каб пры гэтым пераглядзе было забясьпечана разам з паскораным разьвіцьцём збожжавых і тэхнічных культур, узьняцьце разьвіцьця жывёлагадоўлі, шляхам арганізацыі спэцыяльных жывёлагадоўчых саўгасаў аналёгічна збожжавым саўгасам, масавага стварэньня высокатаварных калгасных фэрм і шпаркага пашырэньня кармовай базы.

Ня гледзячы на рад труднасьцяй, якія мелася на шляху арганізацыі жывёлагадоўчых саўгасаў і таварнае жывёлагадоўлі ў калгасах, ужо ў 1930 годзе, на аснове ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі жывёлагадоўлі, тварана моцная база для фарсыраванага разьвіцьця жывёлагадоўлі і вырашэньня ў асноўным жывёлагадоўчай праблемы ў 3-м рашаючым годзе пяцігодкі.

Па БССР на 1 студзеня 1931 г. арганізавана: у прыгарадных саўгасах 12 малочных фэрм, у якіх пастаўлена 1.300 малочных кароў; па лініі Белкалгасаюзу — 22 фэрмы, (4.800 малочных кароў) і па калгасах 465 фэрм (36.700 малочных кароў); Прамыслова-сьвінагадоўчых гаспадарак арганізавана: па саўгасах 74 (15.800 сьвіноматак); па калгасах — 706 (32.500 сьвіноматак). Агульнае стада буйнай рагатай жывёлы па саўгасах узрасло з 15.000 у 1929 г., да 51.100 галоў у 1930 годзе і сьвіное стада з 3.500 галоў да 26.100 галоў.

У кантрольных лічбах сельскае гаспадаркі БССР на 1931 год адным з адказнейшых вучасткаў зьяўляецца жывёлагадоўля. Стада буйнае рагатае жывёлы да канца бягучага году запраектавана давесьці да 2.225.000 галоў, што складае 28 проц. росту супроць мінулага году. Сьвіное пагалоўе на вясну 1931 году вызначана давесьці да 3.925.000 галоў, што складае 76 проц. росту супроць вясны 1930 году. Агульны лік малочных фэрм на 1 студзеня 1932 году будзе даведзены да 563 з агульнай колькасьцю кароў—102.823, з іх: па Белсельтрэсту — 12 фэрм на 3.100 кароў, па Белкаапсаюзу 22 прыгарадныя фэрмы на 6000 кароў, па калгасах 465 фэрм на 77.950 кароў і па першапачатковых жывёлагадоўчых таварыствах да 64 таварных фэрм на 3.200 кароў.

На сьвінагадоўлі матачнае стада на 1 студзеня 1932 г. па саўгасах «Сьвіна воду» павінна быць даведзена да 75.000 галоў і па спэцыялізаваных прамыслова-сьвінагадоўчых калгасах да 150.000 шт. Акрамя гэтага ў несьвінагадоўчых калгасах павінна быць створана таварнае абагуленае матачнае стада ў колькасьці 22.500 сьвіноматак.

У 1931 годзе ў першапачатковых жывёлагадоўчых таварыствах павінна быць пабудавана і прыстасавана 500 каапэрацыйных сьвінарнікаў прамысловага тыпу з колькасьцю ў іх 10.000 сьвіноматак.

Асабліва ўвага павінна быць зьвернута на захаваньне, для пашырэньня стада, усяго прыплоду ўсіх відаў жывёлы, прыгоднага для вытворчых мэтаў. Белкалгасцэнтру дана заданьне вылучыць рад калгасаў і прыстасаваць іх спэцыяльныя памяшканьні для гадоўлі цялят, з такім разьлікам, каб да 1-V—1931 г. у гэтых калгасах было пастаўлена 20.000 цялят. Спэцыяльныя сьвінагадоўчы саўгасы і калгасы павінны паставіць перад сабой баявую задачу ўгадаваць за год ня менш 12 парасят ад аднэй маткі.

Разам з колькасным пашырэньнем стада па ўсіх відах жывёлы, вызначаны мерапрыемствы па якасным яе паляпшэньні. Усё сьвіное стада павінна быць мэтызавана на працягу 2-х год. Да канца бягучага году злучная сетка з пляменнымі палепшанымі кнырамі будзе даведзена да 10.500 галоў. Злучная сетка з бугаямі на 15 сакавіка 1931 г. павінна быць даведзена да 25.000 галоў.

Кармовая база, як аснова для разьвіцьця жывёлагадоўлі таксама павінна быць карэнным чынам перабудавана. Няўстойлівая кармовая база ў мінулым выклікала буйнейшыя страты ў жывёлагадоўлі. Заданьне засіласаваць 990.000 тон кармоў, давесьці ў веснавую пасеўную кампанію плошчу пад кораніплодамі да 80.000 га і пад кармовымі травамі да 552.000 га, правесьці павярхнёвае і каравное палепшаньне сенажаці на плошчы 320.000 га, бязумоўна павінны быць выкананы.

Ужо зараз у раёнах неабходна праверыць ці даведзены плянавыя заданьні на жывёлагадоўлі да саўгасаў, калгасаў, першапачатковых таварыстваў і асобных сялянскіх гаспадарак і ці даны цьвёрдыя заданьні заможна-кулацкай частцы па гадоўлі маладняка і даўгалетняй гадоўлі, з такім разьлікам, каб на 1-V—1931 г. у гэтых калгасах было пастаўлена 20.000 цялят. Спэцыяльныя сьвінагадоўчы саўгасы і калгасы павінны паставіць перад сабой баявую задачу ўгадаваць за год ня менш 12 парасят ад аднэй маткі.

Разам з колькасным пашырэньнем стада па ўсіх відах жывёлы, вызначаны мерапрыемствы па якасным яе паляпшэньні. Усё сьвіное стада павінна быць мэтызавана на працягу 2-х год. Да канца бягучага году злучная сетка з пляменнымі палепшанымі кнырамі будзе даведзена да 10.500 галоў. Злучная сетка з бугаямі на 15 сакавіка 1931 г. павінна быць даведзена да 25.000 галоў.

Кармовая база, як аснова для разьвіцьця жывёлагадоўлі таксама павінна быць карэнным чынам перабудавана. Няўстойлівая кармовая база ў мінулым выклікала буйнейшыя страты ў жывёлагадоўлі. Заданьне засіласаваць 990.000 тон кармоў, давесьці ў веснавую пасеўную кампанію плошчу пад кораніплодамі да 80.000 га і пад кармовымі травамі да 552.000 га, правесьці павярхнёвае і каравное палепшаньне сенажаці на плошчы 320.000 га, бязумоўна павінны быць выкананы.

Ужо зараз у раёнах неабходна праверыць ці даведзены плянавыя заданьні на жывёлагадоўлі да саўгасаў, калгасаў, першапачатковых таварыстваў і асобных сялянскіх гаспадарак і ці даны цьвёрдыя заданьні заможна-кулацкай частцы па гадоўлі маладняка і дарослай жывёлы. Зьвесткі, якія паступаюць з раёнаў кажуць аб дрэнным становішчы з гадоўляй маладняка ўсіх відаў жывёлы. Выкананьне заданьняў па пашырэньні стада патраб

ПРЫМУСОВАЯ ПРАЦА І НЯВОЛЬНІЦТВА—ТАМ, ДЗЕ ПАНУЕ БУРЖУАЗІЯ, САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ПРАЦА—ТОЛЬКІ У КРАІНЕ САВЕТАЎ

На паклёпніцкую кампанію капіталістычных драпежнікаў аб „прымусовай працы“ ў СССР пралетарыят і працоўныя масы БССР і ўсёй краіны саветаў адказваюць яшчэ большай згуртаванасьцю вакол ленінскай партыі і яе ЦК, новым уздымам працоўнага энтузіязму, арганізацыяй новых ударных брыгад, выкананьнем і перавыкананьнем плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі

СССР—адзіная дзяржава сьвядомай сацыялістычнай працы

Ангельская, амэрыканская і француская буржуазія спрабуе зрабіць новую правакацыйную вылазку супроць Савецкага Саюзу. Яны выступаюць з тым, што у Савецкім Саюзе на лесазагатоўках працуюць «прымусова» па 14 гадзін без аховы працы.

Мы, рабочыя, лесарубы і служачыя Барысаўскага Вучлесгасу, катэгарычна выносім свой пратэст і заяўляем, што нічога пахожага ў Савецкім Саюзе няма і ня было.

Мы, рабочыя, лесарубы і служачыя Леспрамгасу пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі з усёй рабочай клясай Савецкага Саюзу няўхільна працуем на выкананьне пяцігадовага пляну ў чатыры гады. Мы, зараз замест таго, што ў буржуазіі працавалі па 16—17 гадзін, зараз працуем 7—8 гадзін.

Сьвядомая праца наша выявілася ў сацпаборніцтве і ўдарніцтве, якім ахоплены амаль што усе рабочыя і служачыя нашага вучастку.

Мы—рабочыя і служачыя зварачваемся праз друк абвясьціць аб гэтым пралетарыяту замежных краін. Адначасова зварачваемся да Савецкага ураду і запатрабаваць ад ангельскіх, францускіх і іншых буржуазных краін аб высылцы да нас сваіх рабочых делегацый, якія маглі-б упэўніцца ў тым, што у Савецкім Саюзе ніякай прымусовай працы ня маецца.

У адказ на хлусьні ангельскай і францускай буржуазіі, яшчэ шырэй разгорнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва на выкананьне пяцігадовага пляну ў 4 гады.

Агульны сход.

У адказ на паклёпы капіталістаў—шырэй разгорнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва

Мы рабочыя і работніцы фабрык «Чырвоная Бярэзіна», «Пралетарская Перамога», і «ЦЭС імя Леніна» заслухаўшы паведамленьне аб гнусных хлусьні, выдуманай капіталістычнымі наймітамі, аб нібы-та існуючай у СССР «прымусовай працы», заяўляем, рашучы пратэст супроць новых выпадкаў клясавых ворагаў, якія па сутнасьці накіраваны да падрыхтоўкі вайсковай інтэрвэнцыі, супроць пралетарыяту СССР.

1. Рост сацыялістычнай індустрыялізацыі і пасьпяховае выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады выклікае бешанае супраціўленьне капіталістычных акул.

Капіталісты ўсіх краін падымаюць вой аб «прымусовай працы» у СССР дзеля таго, каб прыкрыць нячутную эксплёатацыю мільёнаў рабочых і прыгнечаных народаў калёніяльных краін і гэтым самым адцягнуць увагу працоўных ад вялізарнага крызісу і цяжкага беспрацоўя рабочых у краінах капіталізму.

Пралетарыят і працоўныя ўсяго сьвету ведаюць, што толькі ў аднэй краіне СССР маецца вольная творчая праца і пралетарыят СССР куе сваё новае жыцьцё, будуе сацыялістычнае грамадзтва.

2. Толькі ў СССР існуе вольная праца. У нас рабочыя арганізуюцца ў ударныя брыгады і сваім энтузіязмам забясьпечваюць пасьпяховае выкананьне бальшавіцкіх тэмпаў пабудовы сацыялізму.

3. Наш адказ на капіталістычную хлусьню, аб «прымусовай працы» у СССР—будзе выкананьнем і перавыкананьнем прамфінпляну.

4. Разгорнем новы моцны прыліў у ўдарныя брыгады, падымем на вышэйшую ступень сацспаборніцтва, штоденна будзем весьці барацьбу за якасьць прадукцыі і зьнішчэньне прагулаў.

5. У кратчайшы тэрмін аўладаем зброяй тэхнікі, паставім яе на службу рабочае клясы ў барацьбе за сацыялізм.

6. Будзем бязупынна ўзмацняць баяздольнасьць Чырвонай арміі—надзейнага абаронца Кастрычнікаўскай Рэвалюцыі і краіны вольнай працы.

Няхай жыве УсеКП(б)!!

Няхай жыве Міжнародная рэвалюцыя!!

Няхай жыве адважная Чырвоная армія!!

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Агульны сход.

Усебеларускім суботнікам

адкажам на хлусьню імпэрыялістаў аб „прымусовай працы“ ў СССР

Менская агульнагарадзкая канфэрэнцыя ўдарных скразных брыгад рашуча пратэстуе супроць нахабных паклёпаў сусьветнай буржуазіі аб тым нібы Савецкі Саюз ўжывае «прымусовую працу». Не ў СССР, краіне сацыялістычнай працы, краіне, дзе шырака разгортваецца ўдарніцтва, а ў буржуазным сьвеце існуе прымусовая праца.

Капіталісты, вядучы шырокую антысавецкую кампанію, робяць спробу даказаць рабочым, што толькі капіталістычны сьвет забясьпечвае вольную працу. Мы рабочыя СССР, як і рабочыя ўсяго сьвету вельмі добра ведаем, што адзначае вольная праца на капіталістычных прадпрыемствах. Гэта—воля быць беспрацоўным і галадаць.

У адказ на нахабную паклёпніцкую кампанію мы заяўляем, што пад кіраўніцтвам нашай ленінскай партыі, будзем яшчэ больш энэргічна разьвіваць сацыялістычныя формы працы, будзем разьвіваць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, стварэць новыя ўдарныя брыгады узорнай якасьці, рацыяналізацыі, весьці барацьбу за гаспадарчы разьлік у цэхах.

У адказ Джойнсонам Хіксам, Чэрчылям, Пуанкарэ, Фішам і інш. цьвёрдалобым, якія рыхтуюць ваенны напад на СССР, заклікаем рабочых Савецкай Беларусі арганізаваць Усебеларускі суботнік дапамогі чыгуначнаму транспарту. Просім Прэзыдыум ЦСПСБ распрацаваць плян правядзеньня суботніка.

Выконваючы прамфінплян 3-га рашаючага году пяцігодкі, узмацняючы сацыялістычныя формы працы, будзем яшчэ больш узмацняць абароназдольнасьць нашай краіны, падвышаць баяздольнасьць нашай слаўнай Чырвонай арміі.

Адказ рабочых завода „Бальшавік“

На хлусьню капіталістаў аб „прымусовай працы“ ў СССР

22 лютага пасьля працы, рабочыя чырвонаштандарнага «Бальшавіка» сабраліся ў сваю заводзкую сталоўку, каб пратэставаць супроць паклёпніцкай кампаніі на Савецкі Саюз.

Рабочыя з абурэньем заяўляюць, што адухаўлёныя гераічным энтузіязмам працоўныя масы Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам сваёй камуністычнай партыі працуюць над завяршэньнем у гэтым годзе фундамэнту сацыялістычнай эканомікі СССР. Наш скуразавод, на падставе правядзеньня ў жыцьцё Ленінскай нацыянальнай палітыкі, і правільнай генэральнай лініі нашай партыі, вырас у моцны завод з вытворчай праграмай на 1931 год у 10 з лішкам мільёнаў рублёў. Усе гэтыя вялізарныя посьпехі дасягнуты толькі дзякуючы таму, што ў нашай краіне мы працуем на сябе, а не на капіталістаў. На падставе нашых дасягненьняў мы два гады раней былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага сьцягу і ў мінулым годзе перайшлі на 7-мі гадзінны рабочы дзень. Разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва мы павялічаную праграму 1929—1930 году з гонарам выканалі. За ўдарны квартал мы яшчэ больш пашыраную праграму прамфінпляну ня толькі выканалі, але і перавыканалі па ўсіх як колькасных так і якасных паказчыках і на Ўсебеларускім конкурсе ўзнароджаны пераходным чырвоным сьцягам імя ЦСПСБ.

Вынікі нашых гераічных намаганьняў Фіш і К° хочуць сказіць—іхняй подлай выдумкай, што ў СССР пануе прымусовая праца і на яе плячох адзе ажыцьцяўленьне пяцігодкі.

Што прымушае капіталістаў гэтак нагла брахаць на працоўных Савецкага Саюзу—для нас зразумела.

«Мы ведаем, што пэрспэктыва рашаючай перамогі ня можа ня выклікаць новага выбуху энтузіязму і новага працоўнага ўздыму сярод рабочых і сялян. Але яна ня можа таксама не ўзмацніць нялюбасьці і злобы нашых клясавых ворагаў» (з рэзалюцыі сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)Б.

Спроба ворагаў ўсякім спосабам сарваць нашае будаўніцтва, крыжовым паходам Папы Рымскага, кампаніяй супроць савецкага «дэмпінгу», цяпер працягваецца брахнёй аб прымусовай працы ў СССР.

Крыкам аб прымусовай працы ў СССР капіталісты хочуць падрыхтаваць вайну супроць Савецкага Саюзу і адначасова захаваць сапраўдную прымусовую працу існуючую ва ўсіх капіталістычных краінах і калёніях.

Падтрымліваючы патрабаваньні аб стварэньні міжнароднай камісіі з прадстаўнікоў Савецкага і міжнароднага пралетарыяту для дэталёвага абсьледваньня ўмоў жыцьця рабочых і беспрацоўных у капіталістычных краінах і калёніях, мы патрабуем ад ЦСПСБ на чыгуначным транспарце, найхутчэй правесьці Ўсесаюзны суботнік дапамогі чыгунцы.

У нашым будаўніцтве ёсьць рад труднасьцяй, якія мы сваімі сацыялістычнымі мэтадамі працы—сацпаборніцтвам і ўдарніцтвам, перамагаем і рэзгортваем далейшае будаўніцтва Савецкага Саюзу.

За першую палавіну першага кварталу трэцяга рашаючага году пяцігодкі мы пасьпяхова справіліся са сваёй праграмай, не дапусьціўшы прарыву ў важнейшых паказальніках і зьнижэньні сабекошту. У адказ на выцьцё драпежнікаў капіталістычнага сьвету, мы напружым усе свае сілы і прарывы ліквідуем.

На абарону СССР!

За сусьветны Кастрычнік!

За камуністычны суботнік дапамогі транспарту!

Забясьпечым завяршэньне пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі СССР!

Выканаем прамфінплян па ўсіх асабліва, якасных, паказьніках.

Янка Контус.

Чарговы бандыцкі акт фашызму

Тав. Тарашкевіч—выкрадзен агентамі польскай ахранкі

ВІЛЬНЯ, люты 1931 г. (Інф. «Зьвязды»). Фашысцкая ахранка 6-га лютага зрабіла бандыцкі налёт на цягнік, які праходзіў з Данцыгу ў Марыенбург праз польскую тэрыторыю, скрала праяжджаўшага ў ім тав. Б. Тарашкевіча—былога старшыню статысычнай арганізацыі беларускіх працоўных мас—Грамады, аднаго з кіраўнікоў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Тав. Тарашкевіч разам з іншымі пасламі і дзеячамі Грамады быў асуджаны фашыцкім судом на шматгадоўю катаргу. Разгром Грамады, арышты яе кіраўнікоў і крывавы тэрар у адносінах да рабочых і сялянскіх масаў Зах. Беларусі, якая стогне пад ігам фашыцкай акупацыі, не паслабіла размаху нацыянальна - вызваленчага руху на Захадняй Беларусі. Барацьба пашыралася і прыймала ўсё больш вострыя формы. Фашызм для ўмацаваньня сваёй акупацыі стаў шукаць сабе саюзьніка ў абліччы беларускай буржуазіі і кулацтва, прадстаўнікоў яе інтарэсаў — беларускага нацыянал-фашызму на чале з групай рэнэгатаў Грамады — Луцкевіча — Астроўскага. Аднак замацаваньне саюзу польскай і беларускай буржуазіі яшчэ больш абвастрыла клясавую барацьбу ў ЗБ; беларускаму нацыянал-фашызму не ўдалося зьвесьці беларускія працоўныя масы са шляху рэвалюцыйнай барацьбы за сваё вызваленьне.

Фашыцкая дыктатура разам са сваімі беларускімі агентамі і саюзьнікамі пачала рад манэўраў для ашуканьня мас і раскладаньня нацыянальна-вызваленчага руху. Адным з такіх манэўраў было датэрміновае ўмоўнае вызваленьне з турмы тав. Тарашкевіча і іншых дзеячоў Грамады. Гэты манэўр меў на мэце пасеяць ілюзіі ў масах аб зьмене курсу фашыцкай нацыянальнай палітыкі, быў разьлічаны на тое, што яму ўдасца выклікаць хістаньні ў радох нацыянальна-вызваленчага руху, уцягнуць некаторых кіраўнікоў Грамады ў лягер беларускага нацыянал-фашызму. Гэты манэўр фашызму пацярпеў поўнае паражэньне. Паслы Грамады засталіся вернымі рэвалюцыйнаму сьцягу нацыянальна-вызваленчага руху, і працягвалі цьвёрдую барацьбу супроць фашыцкай акупацыі і яе саюзьнікаў ды агентаў беларускіх нацыянал-фашыстаў у ЗБ і беларускіх контррэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў у БССР, якія дапамагаюць фашыцкаму ўраду Польшчы, ў арганізацыі ваеннага нападу на БССР. Паслы Грамады дэмаскавалі ў сваіх выступленьнях манэўры і махінацыі фашыцкай дыктатуры і яе саюзьнікаў. Тав. Тарашкевіч стаў на чале выбарчага камітэту «Змаганьня», які працягваў справу Грамады ў барацьбе супроць фашыцкай акупацыі.

Ярасьці і шаленству фашыцкай дыктатуры, якая памылілася ў сваіх разьлічках, няма граніц. Шалёны тэрар усё больш узмацоўваецца. Пасыпаліся брудныя даносы правакатараў Луцкевічаў і Астроўскіх. Мабілізаваны ўсе сілы дэфэнзывы, каб расправіцца з цьвёрдымі барацьбітамі нацыянальна-вызваленчага руху. Разгул фашыцкага тэрару ў часе выбарчай кампаніі, які выявіўся ў разгроме ўсіх арганізацый нацыянальна-вызваленчага руху, у арышту ўсіх паслоў «Змаганьня» і тысяч рабочых і сялян, прымусіў тав. Тарашкевіча шукаць прытулку за межамі фашыцкай Польшчы. Але і тут фашыцкая ахранка прыняла ўсе меры, каб ажыцьцявіць сваю клясавую помсту, пазбавіць нацыянальна-вызваленчы рух папулярнага ў масах яго кіраўніка і зноў кінуць тав. Тарашкевіча за краты фашыцкіх казэматаў. Два гады таму назад пры дапамозе латвійскай ахранкі польскай дэфэнзыве ўдалося вырваць з радоў рэвалюцыйнага руху тав. Пашына. Цяпер паўтарыўся падобны-ж бандыцкі налёт на тав. Тарашкевіча.

Гэты наглы разбойніцкі напад зьяўляецца новым зьвяном узмацніўшыхся лютасьцю фашыцкай дыктатуры для здушэньня нацыянальна-вызваленчай барацьбы, для падрыхтоўкі вайны супроць СССР. Усьлед за карнымі экспэдыцыямі, якія залілі крывёю і агнём Заходнюю Украіну, фашысцкая дыктатура рыхтуе крывавую лазьню на Зах. Беларусі. Фашыцкая прэса прадракае ўжо новыя рэпрэсіі і ўзмацненьне тэрару. І зараз-жа за гэтымі прадраканьнямі прайшла новая хваля тысячных арыштаў па ўсёй Зах. Беларусі. Фашысцкай дыктатуры неабходна пата піць у крыві нацыянальна-вызваленчы рух для ажыцьцяўленьня сваіх імпэрыялістычных імкненьняў.

Па меры прыбліжэньня моманту ваеннага нападу на СССР, па меры нарастаньня рэвалюцыйнай хвалі і паглыбленьня крызісу фашыцкай дыктатуры—фашыцкі ўрад усё больш завастрае свае патугі, каб задушыць нацыянальна-вызваленчы рух адзін з асноўных фактараў пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы, адзін з важнейшых фактараў, які зрывае імпэрыялістычныя грабежніцкія пляны фашызму.

Арышт т. Тарашкевіча выклікаў абурэньне і пратэсты з боку працоўных мас Зах. Беларусі. ЦК КПЗБ заклікае працоўных даць рашучы адпор новым атакам фашызму супроць нацыянальна-вызваленчага руху. КПП і КПЗБ разгортвае шырокую кампанію пратэстаў супроць фашыцкага тэрару, супроць узмацняючагася нацыянальнага ўціску, за вызваленьне тав. Тарашкевіча, рэвалюцыйных паслоў і ўсіх палітзьняволеных.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ЗЬМЕНУ АРТ. 37 КРЫМІНАЛЬНАГА КОДЭКСУ БССР.

У адпаведнасьці з пастановамі ЦВК і СНК СССР за 31 мая 1930 г. «Пра дзяржаўныя злачынствы, за якія суд можа пазбавіць права на пэнсію і дапамогу» (З. З. СССР 1930 г., № 31, арт. 339) і за 2 верасьня 1930 г. «Пра вайсковыя злачынства, за якія суд можа пазбавіць права на пэнсію і дапамогу» (З. З. СССР 1930 г., № 45, арт. 464), Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР—пастанаўляюць: арт. 37 Крымінальнага Кодэксу БССР запісаць у наступнай рэдакцыі:

«37. Пазбаўленьне праў поўнае ці частковае ўжываецца на менш як на адзін год і ня больш як на пяць гадоў.

Пазбаўленьне праў поўнае ці частковае, як дадатковая да пазбаўленьня волі мера сацыяльнай абароны, пашыраецца на ўвесь час зьняволеньня асуджанага ці, апроч таго, на тэрмін, вызначаны ў прысудзе.

Пазбаўленьне праў на пэнсіі, якія выдаюцца ў парадку сацыяльнага страхаваньня і дзяржаўнага забясьпечаньня і на дапамогу па беспрацоўі, якая выдаецца ў парадку сацыяльнага страхаваньня, можа ўжывацца толькі, як дадатковая мера сацыяльнай абароны, на тэрмін, устаноўлены—судом, за злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі: 64-76; 79-91; 94¹; 95; 103; 107-б; 116-б; 117; 166; 167; 170; 172; 175; 176; 180; 183; 184-191; 203; 204; 206-б; 207-б, 208-б; 214; 217; 219; 225; 227; 228; 231-б; 233; 234; 235; 236; 240-б; 241; 242; 243; 245-б; 246; 247; 250 і 262 Крымінальнага Кодэксу.

У ваенны час суд можа пазбавіць права на пэнсію і дапамогу па беспрацоўі, і за злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 165, 168, 169, 171, 173, 174, 177, 178, 179, 181, 182, 192, 193 і 194 Крымінальнага Кодэксу.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэ.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хаткевіч.**

15 лютага 1931 г.

гор. Менск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА МЕРАПРЫЕМСТВЫ ДЛЯ ПАЛЕПШАНЬНЯ ПРАКТЫКІ КРЭДЫТНАЙ РЭФОРМЫ.

У адпаведнасьці з пастановаю СНК СССР за 14 студзеня 1931 г. «Пра мерапрыемствы для палепшаньня практыкі крэдытнай рэформы газ. Известия ЦИК СССР и ВЦИК» за 15-I—1931 г. Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць ВСНГ, Народны Камісарыят Гандлю, прамысловыя аб'яднаньні і цэнтры каапэрацыйных сыстэм тэрмінова пераглядзець свае гадавыя фінансава-крэдытныя пляны і зрабіць у іх зьмены ў адпаведнасьці з пастановай СНК СССР.

Папраўленыя гадавыя фінпляны павінны быць паданы Беларускай Канторы Дзяржбанку да 20 лютага 1931 г. Беларуская Кантора Дзяржбанку, зрабіўшы патрэбныя зьмены ў гадавым крэдытным пляне, павінна падаць яго на разгляд Дзяржпляну да 1 сакавіка 1931 г.

2. Прапанаваць усім дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям высьвятліць да 25 лютага 1931 г. пытаньне аб патрэбных зьменах у крэдыце ў сувязі з новым парадкам аплаты рахункаў дастаўшчыкаў і падаць у Беларускую Кантору Дзяржбанку матарыялы, на падставе якіх можна ўстанавіць сумы ў дарозе.

3. Устанавіць, што:

а) усе дзяржаўныя прамысловыя прадпрыемствы і гандлёвыя арганізацыі, а таксама раённыя і гарадзкія каапэрацыйныя саюзы падаюць Беларускай Канторы Дзяржбанку крэдытныя пляны за месяц да пачатку кварталу;

б) прамысловыя аб'яднаньні і каапэрацыйныя цэнтры падаюць Беларускай Канторы Дзяржбанку крэдытныя пляны за месяц да пачатку кварталу;

в) ВСНГ, Народны Камісарыят Гандлю і Народны Камісарыят Земляробства падаюць зводны крэдытны плян па камісарыяту за 25 дзён да пачатку кожнага кварталу.

У плянах павінен быць прадугледжан патрэбны крэдыт на сумы ў дарозе.

Абавязаць Беларускую Кантору Дзяржбанку афармляць рахункі па цэнтральнай канторы не пазьней, як праз два дні, а па філіялах—не пазьней, як праз чатыры дні.

4. Абавязаць Беларускай Канторы Дзяржбанку ўжываць да ўстаноў, якія несвоечасова выконваюць арт. 3 гэтай пастановы, меры крэдытнага ўзьдзейнічаньня ў форме частковага скарачэньня крэдытаваньня.

5. Даручыць ВСНГ і Народнаму Камісарыяту Гандлю пераглядзець свае крэдытныя пляны ў адпаведнасьці з паказаньнем вышэй пастановаю СНК СССР у сэнсе забароны скарыстаньня страхавых рэзэрваў.

6. Даручыць Белкаапсаюзу не пазьней як за месяц да пачатку кожнага кварталу ўстанаўляць мінімальны тэрмін рэалізацыі тавараў па спажывецкай каапэрацыі, асобна па вясковаму і гарадзкому зьвеньням, выходзячы з найменшай затрымкі тавараў на складах, базарах і крамах каапэрацыі, а таксама даваць кожны месяц весткі аб астачах тавараў.

7. Абавязаць пакупшчыкаў пры акцэпце рахункаў адзначаць, па якому кантакарэнту (па зваротных сродках альбо па капітальнаму будаўніцтву) павінна сьпісвацца сума рахункаў.

Даручыць Беларускай Канторы Дзяржбанку ўстанавіць сталы нагляд за тым, каб рахункі па капітальнаму будаўніцтву не адносіліся на кантакарэнт па заротных сродках і наадварот.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Юстыцыі даць паказаньні мясцом аб прыцягненьні да крымінальнай адказнасьці за няправільную адзнаку пры акцэпце назвы кантакарэнта, з якога павінна сьпісвацца сума рахунку.

8. Адзначыць, што Беларуская Кантора Дзяржбанку ня ўжыла належных захадаў для падрыхтоўкі рахунковых працаўнікоў.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы разам з Беларускаю Канторою Дзяржбанку вырашыць на працягу дэкады пытаньне аб задаваленьні самых неадкладных патрэб Дзяржбанку ў рахунковых працаўніках.

9. Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы мабілізаваць 90 кваліфікаваных рахунковых працаўнікоў для патрэб сыстэмы Дзяржбанку.

10. З прычыны значнага павялічэньня апэрацый Дзяржбанку і масавасьці іх характару, прапанаваць НК РСІ разам з Беларускаю Канторою Дзяржбанку распрацаваць не пазьней як праз 15 дзён пытаньне аб мэханізацыі асобных галін працы Дзяржбанку.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэ.**

Нам. Кіраўніка Спраў СНК і ЭКАНА БССР **Л. Дубавіцкі**

13 лютага 1931 г.

г. Менск.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

З ПАНЯДЗЕЛКА 23-га ЛЮТАГА

„Чырвоная Зорка“	Новы мастацкі фільм АПОШНІ БЭК. Хроніка Саюзкіно № 3. Звыш праграмы гукавы фільм. Пачатак а 7, 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса а 5 гадзіне.
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“	2-і тыдзень савецкі фільм вытворчасьці „Працкіно“ ЖАНЧЫНА Ў ЛЕСЕ. Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. Каса ад 4 гадз. 30 хв.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“	Новы мастацкі фільм ВАЙНА—ВАЙНЕ. ЗВЫШ ПРОГРАМЫ „Брацішкі спаборнічаюць“. Пачатак 1-га сэансу а 6 з пал. гадз. Каса ад 4 гадз.
Дзіцячы кіно тэатр „ЮНЫ ПІНЭР“	Эпізод барацьбы з басмач ствам ШАКАЛЫ РАВАТА кіно-п'еса ў 9 частках. Пачатак сэансаў з 1 гадз. дню. Каса а 12 гадз. дню.

ФАТАГРАФІЯ БЕЛДЗЯРЖКІНО

для дэлегатаў X Усебеларускага зьезду саветаў робіць фото-здымкі бяз усякай чаргі, СА СКІДКАЙ 50% з устаноўленага тарыфу

Адрас фатаграфіі: САВЕЦКАЯ 81.

Адчынена штодзённа з 10 гадз. раніцы да 6 гадз. увечары

25 лютага а 7 гадзіне ўвечары ў ЗАЛЕ БАН

АДБУДЗЕЦЦА НАРАДА КАМУНІСТЫХ—

навуковых працаўнікоў і асьпірантаў усіх навукова-дасьледчых устаноў гор. Менску

ПАРАДАК ДНЮ:

1) Задачы БАН у галіне канцэнтрацыі навукова-дасьледчай працы ў БССР (дакладчык т. ГОРЫН).

На нараду павінны зьявіцца ўсе камуністыя—навуковыя працаўнікі і асьпіранты ўсіх навукова-дасьледчых устаноў гор. Менску і без спазьненьня.

ПРЭЗЫДЫУМ АКАДЭМІІ

24 лютага а 2 гадзіне дню

АДБУДЗЕЦЦА СХОД У АГУЛЬНАЙ ЗАЛЕ БАН

усіх асьпірантаў Інстытуту асьпірантуры Акадэміі

ПАРАДАК ДНЮ:

1) Бліжэйшыя задачы БАН і падрыхтоўка новых кадраў. (Дакладчык т. ГОРЫН)

2) Аб дадатковых выбарах новых акадэмікаў БАН (Дакладчык т. ШЧАРБАКОЎ)

На сход павінны зьявіцца ўсе асьпіранты Інстытуту асьпірантуры БАН і без спазьненьня

ПРЭЗЫДЫУМ АКАДЭМІІ

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА

25 лютага адбудзецца Творчы вечар БелАППУ

ПЛАТОН ГАЛАВАЧ

чытае аповесьць „Спалох на загонах“

Пачатак роўна а 7 гадз увеч. Уваход вольны.

Праўленьне Дому Пісьменьніка.

ПАПРАЎКА.

У № 45 (3194) нашае газэты ад 23-га лютага г.г. у надрукаванай на 4 старонцы абвестцы „Белсельбуду“ ўкралася памылка.

НАДРУКАВАНА: Кіраўнік трэсту Сьміроўкін А. Я.

ТРЭБА ЧЫТАЦЬ:

Кіраўнік трэсту Сьліўкін А. Я.

Аршанская школа ФЗВ МБЛ чыгункі ПАВЕДАМЛЯЕ,

што заявы ад жадаючых паступіць у школу

ПРЫМАЮЦЦА ДА 10-га САКАВІКА.

Заявы прымаюцца ад асоб з адукацыяй 7-годкі і ад асоб, якія канчаюць 7-годку ў бягучым годзе, і маюць узрост ня менш 16 год.

Жадаючым паступіць у школу трэба не пазьней 10-га сакавіка даслаць наступныя дакументы:

1. Пасьведчаньне аб скончэньні 7-годкі ці даведку аб тым, што канчае яе (ёлета;
2. Метрыку аб нараджэньні;
3. Заверэную анкету альбо даведку аб соц. становішчы бацькоў;
4. Даведку аб стане здароўя.

БАРЫСЁНАК.

АРШАНСКІ ТЭКСТЫЛЬНЫ ТЭХНІКУМ

абвяшчае вясеньні набор на 1 курс 120 асоб.

Заявы прымаюцца да 15-3-31 году. Заняткі пачнуцца з 1-4-31 году.

Правілы прыёму згодна даведкі НКАБ. 65 проц. будзе забясьпечана стыпэндыяй і інтэрнатам.

Заявы накіроўваць па адрасу: г. Ворша, Тэкстыльны тэхнікум.

Нам. дырэктара АЛЯКСЕЙЧЫК.

МАГІЛЕЎСКІ БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ

абвяшчае

ВЯСЕНЬНІ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ на 1 курс на ніжэйпамянёныя архітэктурныя аддзяленьні:

1. Агро-індустрыяльнае аддз. будзе прынята 30 асоб
2. Фабрычна-заводзкае „ „ „ 30 асоб
3. Жыльлёвае аддз. „ „ „ 30 асоб

У тэхнікум прыймаюцца асобы скончыўшыя 7 годку. Узрост паступаючага ад 16 да 25 гадоў (для рабочых да 30 гадоў). 70 проц. раб., 15 проц. сялян калг. 15 проц. служ. па сац. становішчу будзе прынята.

Прыём заяў ад асоб жадаючых паступіць прыймаюцца да 20 сак віка г. г, З 20 да 25 сакавіка залічэньне ў тэхнікум.

Да заявы неабходна дадаць наступныя дакументы: Аб адукацыі, узросьце, праве голасу, здароўі, сацыяльным становішчы і заверэную анкету, 2 фатаграфічныя карткі і на 25 кап. паштовых марак для адказу аб залічэньні.

Тэхнікум забясьпечвае студэнтаў 65 проц. стыпэндыяй у разьмеры 36—54 руб у месяц.

Заняткі ў тэхнікуме пачнуцца 5 красавіка г. г., аб чым кожны залічаны студэнт атрымае вызаў на заняткі.

Дырэктар тэхнікуму ЛІПСКІ.

Галоўнае Кіраўніцтва Камунальнае Гаспадаркі пры СНК БССР

(Камунальная і Пажарная Інспэкцыі б. Народнага Камісарыяту Ўнутраных Спраў)

ПЕРАЕХАЛА Ў НОВАЕ ПАМЯШКАНЬНЕ

Адрас: Менск, Пляц Волі, 2, (побач з Гарсаветам—уваход з вугла, супроць бульвару).

ГАЛОЎКАМГАС

ЗГУБЛЕНЫ

Картка на каня № 80, выданая Мазырскім Ваенкаматам на імя Вайтылавай М., кв. 1372-п.

Пашпарт № 1, вайсковая кніжка, акладны страхавы ліст на імя Некрашэвіча Р. Н., кв. 1372-п.

Мэтрычны выпіс № 200 Хамяка М. В., кв. 1372-п.

Камсамольскі білет № 35921 Шэйкмана А. Ш., выданы Прудкоўскім сельсаветам, кв. 1372-п.

Членскі саюзны білет № 10082 Церашковіча, выданы Мазырскім саюзам дрэваапрацоўшчыкаў, кв. 1372-п.

Нарад № 42 на правоз грузу са ст. Калінкавічы да г. Мазыра, выданы Мазырск. агенцтвам гарадзкога спажыўтаварыства на імя Верашкевіча Н., кв. 1372-п.

Паявая кніжка № 1838 Гушляка Г. М., выданая Мазырскім праўл. «Змічка», кв. 1372-п.

Паявая кніжка № 777 Вэгера А. П., кв. 1372-п.

Асабовае пасьведчаньне № ш-14 Цэйчуку П. А., кв. 1372-п.

Вайсковы білет № 1 Некрашэвіча Р. кв. 1972-п.

Вайсковая кніжка № 2519, выданая Калінкавіцкім Ваенкаматам на імя Цімафеева С. Ф., кв. 1372-п.

Паявая кніжка № 1996, выданая Мазырскім праўленьнем ЦРК на імя Вайсман Б. Ш., кв. 1372-п.

Членскі білет № 6-17498 Френклака С. Д., выданы саюзам будаўнікоў, кв. 1972-п.

Паявая кніжка № 6541 Дашкевіч В. С., выданая Мазырскім ЦРК, кв. 1372-п.

Членскі білет № 643 Ліотка І., выданы саюзам саўгандльслужачых, кв. 1381-п.

Сяброўская кніжка саюзу сельгаспрабочых № 78527, выданая Мясцкомам Менскага Акрземаддзелу на імя Азерава М. С., кв. 1382-п.

Кніжка на каня Музычэнка П., выданая Нараўлянскім РВК, кв. 1356-п.

Вайсковая кніжка № 124 Казьлюка П. Ф., кв. 1357-п.

Вайсковы білет Крэнта Д. А., выданы Мазырскім Акрваенкаматам, кв. 1358-п.

Вайсковая кніжка № 836 Шыкіна С. І., выданая Азарыцкім РВК, кв. 1359-п.

Паявая кніжка № 926 Шыкіна С. І., выданая Азарыцкім спажыв. таварыствам, кв. 1360-п.

Дакумант Гатальскага В. І., выданы Ленінградзкім портам арцелі 12988, кв. 1361-п.

Чырвонаармейская кніжка Зыля І. І., выданая 5 страл. палком кв. 136-п.

Галоўлітбел № 598. Друкарня імя тав. СТАЛІНА.